WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**18** снежня 2010 г. **СУБОТА**
№ 248 (26856)
Кошт 650 рублёў

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


Фота БЕЛТА.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «У БЕЛАРУСІ НЯМА НЕАБХОДНАСЦІ ДЭВАЛЬВАВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ВАЛЮТУ»

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў цэнтральнае сховішча Нацыянальнага банка Беларусі.**

На 1 снежня 2010 года аб'ём міжнародных рэзервовых актываў Беларусі ў вызначэнні спецыяльнага стандарту распаўсюджвання даных МВФ склаў $5705,4 млн. З 1 студзеня 2006 года па 1 снежня 2010 года золатавалютныя рэзервы ў вызначэнні МВФ павялічыліся на $4408,9 млн, або больш як у чатыры разы. З 1 студзеня 2010 года золатавалютныя рэзервы ў вызначэнні МВФ павялічыліся на $52,9 млн, або на 0,9 працэнта.

Міжнародныя рэзервовыя активы ў нацыянальным вызначэнні на 1 снежня 2010 года дасягнулі гістарычнага максімуму і склалі $6788 млн. За аналагічны перыяд рэзервовыя актывы ў нацыянальным вызначэнні павялічыліся на $5233,1 млн, або больш як у чатыры разы. За гэты год золатавалютныя рэзервы ў нацыянальным вызначэнні павялічыліся на $809,5 млн, або на 13,5 працэнта.

У адпаведнасці з указам Прэзідэнта ад 8 лістапада 2004 года № 546 Нацбанк фарміруе фонд каштоўных камянёў. Варта адзначыць, што яго фарміраванне было пачата ва ўмовах поўнай адсутнасці каштоўных камянёў у Нацбанку. За час, які прайшоў з апошняга візіту кіраўніка дзяржавы ў цэнтральнае сховішча, фонд узрос з 24,3 млн еўра на 1 студзеня 2006 года да 49,2 млн еўра на 1 снежня 2010 года. На сёння ў фондзе залічана каля 27,1 тыс. каратаў алмазнай сыравіны, а таксама 34,6 тыс. каратаў брыльянтаў.

Эканоміка Беларусі паспяхова спраўляецца з павышэннем на трэць узроўню зарплат у бюджэтнай сферы, заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказываючы на пытанні журналістаў. Ён адзначыў, што павышэнне зарплат у бюджэтнай сферы амаль на 30 працэнтаў — гэта вельмі вялікі рост. «Мы з ім спраўляемся, эканоміка спраўляецца. Усе крычалі: «Ах, ах, не справімся!» Гэта павышэнне заробтнай платы ніяк не адаб'ецца на нашай эканоміцы».

Больш таго, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, павышэнне зарплат было зроблена напярэдадні навагодніх свят. А адпаведна, людзі выкарыстаюць гэтыя грошы, каб купіць нейкія тавары ў магазінах, што ў канчатковым выніку пойдзе на карысць эканомікі. «Я думаю, гэта таксама нармальна. Мы ж не ашукалі людзей. Мы хацелі, каб вы гэтыя грошы ўклалі ў тавары, якія сёння прадаюцца ў Беларусі. Не адбылося ўсплёску цэн — не адбылося. Таму абсалютна баяцца няма чаго», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Цяпер у Беларусі адсутнічаюць тэндэнцыі, якія садзейнічалі б росту цэн, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Прадстаўнікі СМІ адзначылі, што адной з самых хвалюючых людзей тэм з'яўляецца магчымы рост цэн. У прыватнасці, у лістападзе дзяржава амаль на трэць павысіла ўзровень зарплат у бюджэтнай сферы. У сувязі з гэтым у кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, ці планууецца рост цэн у Беларусі. СТАР. 2

## БЕЛАРУСЫ АДЗНАЧАЮЦЬ ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ І ПАЛІТЫЧНУЮ СТАБІЛЬНАСЦЬ

**У цяперашні час палова насельніцтва (49%) лічыць сацыяльна-эканамічнае становішча ў рэспубліцы стабільным. На паступовае яго паляпшэнне паказалі 28%, адзначылі пагаршэнне — 15% рэспандэнтаў.**

З II квартала 2009 г. намецілася тэндэнцыі павелічэння з 13 да 28% колькасці грамадзян, якія мяркуюць, што сацыяльна-эканамічнае становішча краіны мае пазітыўную дынаміку, і змяншэння з 36,5 да 15% тых, хто прытрымліваўся супрацьлеглай думкі.

Палітычную абстаноўку ў Беларусі большасць насельніцтва (75%) лічыць спакойнай. Ацэньваюць яе як напружаную 16,5% рэспандэнтаў. Думка грамадзян аб палітычнай сітуацыі ў краіне за год не змянілася.

**Ул. інф.**

## ВУЧОНЫЯ ВЫДАЛІ ПАШПАРТЫ БЕЛАРУСКІМ ДУБАМ

Як паведаміў карэспандэнт агенцтва «Мінск—Навіны», дырэктар Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Кавалевіч расказаў, што праведзена генетычная пашпартызацыя дуброў рэспублікі. Прычынай пачатку паўсюдных даследаванняў стала праблема усыхання каштоўных дрэў.

— Мы вызначылі 14 мацярынскіх ліній беларускіх дубоў. З іх 5 асноўных, унікальных па сваіх генетычных характарыстыках, — патлумачыў Аляксандр Іванавіч. Гэтыя звесткі дапамогуць выбіраць найбольш каштоўны пасадачны матэрыял для закладкі новых лясных насаджэнняў. Выканаиая вучонымі праца дапаможа захаваць беларускія дубровы.

**Ірына ЮДЗІНА,**
*«Мінск—Навіны».*

## ВАРЫЯНТЫ ВЫПЛАТ НА ДЗЯЦЕЙ ПЛАНУЕЦЦА РАЗГЛЕДЗЕЦЬ СЁЛЕТА

Пытанне аб прывязцы дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў да сярэдняй зарплаты маці плануецца вывучыць у рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011 і 2015 гады — пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**.

**Сяргей ГРЫБ.**

**БЕЛАРУСБАНК**

Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 17.12.2010 зарегистрированы изменения в Проспект эмиссии облигаций девяносто шестого – девяносто седьмого выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» в части сокращения срока проведения открытой продажи облигаций до 20.12.2010.

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.
Лицензия Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385613 действительна до 29.07.2012 (изменения и (или) дополнения внесены на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь от 28.05.2010 № 118).
УНП 100325912.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

**WWW.RLT.BY**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Зенит-БелОМО» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Вилейский р-н, Нарочанский с/с, д. Принта**, в составе:

**Лот № 1:** овощехранилище, об. пл. 589,4 кв.м. Начальная цена с НДС – **176 525 026 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,5456 га.**

**Лот № 2:** гараж, об. пл. 459,6 кв.м. Начальная цена с НДС – **118 966 406 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,7647 га.**

**Лот № 3:** склад хранения грубых кормов, об. пл. 442,9 кв.м. Начальная цена с НДС – **54 280 583 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,1918 га.**

**Лот № 4:** здание административно-хозяйственное, об. пл. 87,5 кв.м. Начальная цена с НДС – **28 669 977 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,1220 га.**

**Цены снижены на 20 %.**

Задаток 10 % от начальной цены лота.

**Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.11.2010.**

Аукцион состоится **28.12.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ИНФОРМИРУЕТ:**

Время и дата проведения повторного аукциона по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Вечерний Минск» от 03.12.2010 и газете «Звязда» от 02.12.2010) **ПЕРЕНОСЯТСЯ** с 11.00 17 декабря 2010 года **на 11.00 29 декабря 2010 года.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 03.12.2010 по 27.12.2010 включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 328 58 48.**

## САЛОДКАЕ ПРЫЗНАННЕ РАДЗІМЕ



*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.12.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 005,00 | 1 чэшская крона | 159,19 |
| ▼ 1 еўра | 3 993,95 | 1 польскі злоты | 1006,38 |
| 1 латвійскі лат | 5 640,54 | ▲ 1 расійскі рубель | 97,98 |
| 1 літоўскі літ | 1 159,74 | 1 украінская грыўня | 376,28 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,6682 |
| 10 UAH | 38,4554 |
| 1000 BYR | 10,2023 |
| EUR | 40,7979 |

# «У БЕЛАРУСІ НЯМА НЕАБХОДНАСЦІ ДЭВАЛЬВАВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ВАЛЮТУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Цэны мы ўжо даўно не плануем, і планаваць наогул цэны шкодна ў рыначнай эканоміцы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Па асобных пазіцыях мы стрымліваем цэны (хлеб, мука і іншае) — па жыццёва важных 20—30 пазіцыях. Часам стрымліваем, калі яны зашкальваюць. Але без гэтых 30 пазіцый людзі жыць не могуць. Таму яны ўзяты пад кантроль».

Што датычыцца цэн на астатнія тавары, то, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, іх няма неабходнасці кантраляваць. «Здарылася так, што за межамі нашай краіны, па перыметры, цэны крыху ніжэйшыя, чым у нас. Гэта сведчыць аб тым, што вывазу тавараў не будзе і ўсплёску цэн не будзе, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нам трэба трымаць парытэт цэн, на жаль. Мы маглі б і ніжэй іх мець, але мы не можам мець цану ніжэй на прадукты харчавання і іншыя, чым, дапусцім, у Расіі. Вы ж памятаеце, калі цэны ў нас былі ніжэй, а ў іх вышэй, спекулянты ўсё вывозілі і там перапрадавалі. Таму мы нікуды не дзенемся, нам трэба трымаць гэты парытэт — сёння гэты парытэт ёсць. Сёння няма тых тэндэнцый, якія садзейнічалі б росту цэн».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па асобных пазіцыях, напрыклад, сярод імпартных тавараў, магчымы нейкія змяненні ў кошце на паўпрацэнта або працэнт.

Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі запыталі ў кіраўніка дзяржавы, ці трэба чакаць дэвальвацыі беларускага рубля ў пачатку 2011 года, аб чым актыўна нагнятаюць чуткі некаторыя СМІ.

«Напэўна, гэта ўжо старое як свет. Разумны чалавек, у якога былі нейкія сумненні і хваляванні, зусім у адваротным напрамку развярнуўся пасля таго, як, па-першае, мы вытрымалі наход некаторых людзей у банк, каб абмяняць нашу валюту на замежную: мы абсалютна ўсіх задаволілі — мяняйце. Праўда, трэба аддаць належнае, што ўсе, хто памяняў грошы, яны валюту аднеслі ў гэтыя ж банкі. Для дзяржавы ў прынцыпе гэта ўсё адно. Людзі проста глупствам займаліся. Але я па-пярэдзіў людзей — гэта было іх права», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, як толькі народ убачыў, што дзяржава здольна задаволіць попыт на валютным рынку, гэта хваля пайшла на спад. Па-другое, прадоўжыў кіраўнік дзяржавы, «разумныя людзі заўважылі нашы дамоўленасці ў Маскве», пасля чаго хваля попыту на замежную валюту сышла на нішто. «Людзі разумеюць, што калі ў эканоміцы зрухі, у цэнавых адносінах — значыць, будзе палягшэнне і на валютным рынку», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што знаходзіцца пад уражаннем пасля наведвання цэнтральнага сховішча Нацбанка. «Тое, што я тут бачу, яно ўражвае. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас дастаткова рэзерваў для таго, каб кіраваць валютным рынкам у нашай краіне, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Таму іх справа — крычаць. Вы ж ведаеце, хто стварае такі ажыятаж — гэта тыя людзі, якія жывуць на прынцыпе чым горш, тым лепш для іх. Вельмі кароткі прамежак часу паказаў, чаго варты гэтыя заявы».

«Я магу яшчэ раз паўтарыць тое, што казаў летам і на «Дажынках»: лёс наш — у нашых руках, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Нармальна без панікі будзем жыць — ніякіх праблем не будзе». Пры гэтым беларускі лідар адзначыў, што для таго, каб вырашаць праблемы, у краіне ўсё ёсць. «Тое, што вы (журналісты. — Заўвага БЕЛТА) бачылі, — гэта толькі трэць залатога запасу, якая тут захоўваецца. Дзве трэці захоўваюцца ў іншых месцах. Тое ж самае і па валюце. Мы сёння маем дастаткова золатавалютных рэзерваў, прыкладна $6-7 млрд, для таго, каб задаволіць любы попыт на валюту. Нам няма неабходнасці сёння дэвальваваць нацыянальную валюту», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Таму, дадаў Аляксандр Лукашэнка, трэба жыць абсалютна спакойна і глядзець у будучыню. «Як мне здаецца, у нас перспектывы ніздрэнныя», — сказаў на заканчэнне кіраўнік дзяржавы.

«Што датычыцца ЖКГ, то гэта пытанне вызначана: мы не будзем павышаць кошт паслуг ЖКГ апрача цыянальна росту зарплаты, ні ў якім разе. Тады які сэнс — мы з'ядзім усю заработную плату», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт падкрэсліў, што калі ў наступным годзе ўзнікне неабходнасць у павышэнні кошту паслуг ЖКГ, то яны ўзрастуць не больш як на $5. «Нягледзячы на тое, што насельніцтва аплачвае толькі 30 працэнтаў (кошту паслуг ЖКГ. — Заўвага БЕЛТА), а 70 працэнтаў мы датуем, нягледзячы на гэта, хутчэй за ўсё, на працягу года, калі не здарыцца якіх-небудзь катаклізмаў, мы такім шляхам будзем ісці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяпер няма падставы для росту цэн на паслугі ЖКГ, таму што для Беларусі, напрыклад, патанне нафта, камплектуючыя і сыравіна. «Дык якія падставы для росту цэн? Няма такіх падстаў, асабліва па ЖКГ. Таму трэба супакоіцца і спакойна жыць. У бядзе мы сваіх людзей не пакінем, гэта дакладна», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў зрабіў па-мужчынску, прапанаваўшы зняць праблемныя пытанні ў адносінах Беларусі і Расіі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што маскоўскія дамоўленасці ацэньваюцца ў $4 млрд у год. «Нават калі б мне давялося здацца за $4 млрд у год, як яны называюць, я за $4 млрд гатовы. Гэта грошы для нашага народа і дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён расказаў, што, прыехаўшы ў Маскву напярэдадні пасяджэння Міждзяржсавета ЕўрАзЭС і Вышэйшага органа Мытнага саюза, ён атрымаў прапанову расійскага боку сустрэцца і абмеркаваць праблемныя пытанні беларуска-расійскіх адносін, каб зняць іх да пасяджэння. «Чаго я буду ўпірацца? Мне прапануюць сустрэцца, абмеркаваць праблемы», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Па-першае, я нікуды не поўзаў. Па-другое, мы не ініцыіравалі гэтую сустрэчу і вырашэнне гэтых пытанняў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Аднак, як адзначыў ён, гэтыя пытанні ўзніклі не спантанна, над імі спецыялісты працавалі больш як месяц. «Напярэдадні мы атрымалі інфармацыю: урады Расіі і Беларусі не дамовіліся. Значыць, прэзідэнты павінны былі прымаць рашэнне. Сустрэліся і прынялі рашэнне».

«Падкрэсліваю: яны гэта ацэньваюць у $4 млрд. Зусім магчыма. Але гэта калі ў лоб ацэньваць. А калі праз бізнес, прадпрыемствы, то, магчыма, гэта будзе больш», — адзначыў Прэзідэнт. На яго думку, гэтыя дамоўленасці ўплываюць на курс нацыянальнай валюты і ў цэлым на настрой людзей. «Калі нехта гаворыць, што гэта піяраўскія рашэнні, добра, няхай піяраўскія, але гэта $4 млрд», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў дасягненні дамоўленасці па нафце галоўнае, што Беларусь атрымае яе з Расіі ў такой колькасці, у якой яна неабходная. «Нафта ў гэтым годзе каштавала амаль $600 за тону. Калі бяспошлінна — напалавіну менш. Гэта што, дрэнна? — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. — Так, калі мы будзем расійскую нафту перапрацоўваць, толькі расійскую, у сябе на прадпрыемствах і затым прадаваць, то мы будзем выважаць пошліны дзяліць. А адтуль ужо са сваёй пошліны Расія нам таксама частку грошай addae. Гэта што, дрэнна?» «Таму, калі няма чаго сказаць, пачынаюць наводзіць цень на пляцень», — дадаў ён.

Прэзідэнт лічыць гэта нармальнымі дамоўленасцямі. Ён адзначыў, што адкрыта падзякаваў за гэта расійскаму боку. Гэтыя рашэнні даюць магчымасць Беларусі выканаць усе паказчыкі не да 2015, а да 2013 года. «Гэта будуць зрухі па ўсіх напрамках», — падкрэсліў беларускі лідар.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яшчэ неабходна дамовіцца па пастаўках прыроднага газу. «Ідуць цяжкія перагаворы», — сказаў Прэзідэнт. «Але якія б там дамоўленасці ні былі, эканоміка ў будучым годзе прагледзаецца лепш, чым мы планавалі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што цяпер аналізуюцца і апрацоўваюцца звароты грамадзян, сабраныя за перадвыбарны перыяд. Скаргі на работу органаў праваахоўнай сістэмы займаюць другое месца пасля пытанняў ЖКГ, а ўнутры гэтага пласта на рабоце судоў — лідзіруюць. «Калі людзі ідуць з такімі праблемамі, значыць, трэба звярнуць на гэта ўвагу. І гэта будзе зроблена», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Я паабяцаў, што ў першым паўгоддзі 2011 года мы, перапрацаваўшы гэту інфармацыю, прымем рашэнне. Калі трэба — сістэмна, калі трэба — кадрава, але гэта рашэнне будзе прынята. Гэта я вам гарантую».

Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар ЦК БРСМ:

# «У БЕЛАРУСІ ЛЁГКА БЫЦЬ МАЛАДЫМ!»



**Актыў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — гэта паўмільёна ініцыятыўных, крэатыўных, мабільных юнакоў і дзяўчат, якія жадаюць уносіць свой уклад у развіццё краіны. У іх шмат ідэй і задум, якія ім дапамагае ўвасобіць у жыццё моладзевы саюз. Вядома ж, не абмінулі ўвагай маладыя людзі і найважнейшую палітычную падзею года — выбары Прэзідэнта Беларусі. Як адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ Ігар Бузоўскі, моладзевы саюз сярод іншага будзе адказваць і за арганізацыю сацыялагічных апытанняў на выхадзе з выбарчых участкаў. Вопыт такой работы ў БРСМ ужо ёсць.**

***— Ігар Іванавіч, у чым канкрэтна заўтра будуць задзейнічаны актывісты вашай арганізацыі?***

— Удзел БРСМ у выбарах сапраўды шматгранны, таму што паўмільёна чалавек — гэта вялікая колькасць талентаў, здольнасцяў, ведаў. Гэты шырокі спектр выкарыстоўваўся і выкарыстоўваецца сёння ў нашых праектах і праграмах, якія рэалізуюцца на працягу ўсіх месяцаў перадвыбарчай кампаніі і непасрэдна ўдзелу ў выбарах Прэзідэнта Беларусі.

Калі гаварыць канкрэтна, то гэта, вядома, вылучэнне нашых прадстаўнікоў у камісіі для работы на выбарчых участках і ў якасці назіральнікаў, работа нашых маладых людзей падчас сацыялагічных даследаванняў. Так званыя экзіт-полы, магчыма, для многіх не вельмі вядомае паняцце. Гэта апытанне на выхадзе з выбарчага ўчастка, якое дазваляе рабіць вывад да канчатковага падліку галасоў. Гэта сацыялагічнае даследаванне, якое з дастатковай верагоднасцю паказвае, як прагаласавалі беларусы на ўсёй тэрыторыі краіны. Гэта каласальная работа, якая для нас не новая, бо мы ўжо прымалі ўдзел у такіх апытаннях на працягу некалькіх выбарчых кампаній: падчас выбараў у парламент, мясцовыя саветы і падчас ранейшых прэзідэнцкіх выбараў. І мы з задавальненнем прынялі прапанову камітэта моладзевых арганізацый паўдзельнічаць у правядзенні сацыялагічнага апытання — экзіт-пола. Каля 2 тысяч актывістаў будуць працаваць па ўсёй краіне, праводзіць апытанні на выхадзе з выбарчых участкаў, і кожную гадзіну мы будзем збіраць гэтую інфармацыю, каб аператыўна праводзіць аналіз ходу галасавання. Спадзяюся, што яна будзе карыснай для сацыёлагаў, выбарчай камісіі, назіральнікаў.

Трэба сказаць, што мы ўжо правялі папярэдняе апытанне ва ўсіх рэгіёнах і абласных цэнтрах краіны. У ім прынялі ўдзел 35 тысяч чалавек. Тэматыка апытання была такая — ці прыйдзеце вы на выбары. Для нас было вельмі прыемна, што практычна тры чвэрці патэнцыйных выбаршчыкаў прымуць удзел у выбарах. Гэта значная лічба і гарантыя таго, што будзе забяспечана шырокая яўка на выбарчыя ўчасткі.

А што датычыцца іншых праектаў і напрамкаў работы ў рамках перадвыбарчай кампаніі, то не так даўно завяршыўся марафон «Зрабі свой выбар. Наш выбар правераны часам». Свой выбар мы робім мэтанакіравана і аб гэтым заяўлялі на сустрэчах у рэгіёнах і абласных цэнтрах, там, дзе праводзіўся марафон. Гаварылі аб той стратэгіі, той моладзевай палітыцы, якая рэалізуецца ў нашай краіне, тых напрамках дзейнасці, якія дазваляюць сёння моладзі праяўляць свае таленты, здольнасці пры дапамозе магчымасцяў, якія ёсць у БРСМ.

Моладзевы марафон завяршыўся днямі ў Гродне, але ён стаў стартам для далейшага развіцця моладзевых ініцыятыў па ўсёй краіне. Таму што адна справа — заяўляць праекты, а іншая — запрашаць моладзь да ўдзелу ў іх. Мы пераканаліся ў тым, што маладое пакаленне зацікаўлена ў самых яркіх напрамках дзейнасці, якія мы прэзентавалі, пачынаючы ад мерапрыемстваў, акцый, праектаў для сельскай, навуковай моладзі, для юнакоў, якія сёння рыхтуюцца да службы ў арміі. Гэта праекты «Уладар сяла», «Да абароны Айчыны гатовы», праекты, якія сёння аб'ядноўваюць, так бы сказаць, нефармальную моладзь — моладзевыя субкультуры. Гэта брэйкдансісты, велатрыялісты, цiктонікі і іншыя. Усе маладыя людзі, якія жывуць цікавым, напоўненым сэнсам і для сябе, і для дзяржавы жыццём, якія сёння накіраваны на тое, каб удасканальвацца, проста жыць паўнаварстасным жыццём; мы імкнёмся іх падтрымліваць. Калі такая магчымасць сёння даецца дзяржавай, мы гаворым, што гэта падтрымка на самай справе нам неабходна. Мы за гэта дзякуем і будзем гэту палітыку, безумоўна, падтрымліваць. Падчас моладзевага марафону мы пераканаліся ў тым, што такая пазіцыя БРСМ падтрымліваецца не толькі саюзнай моладдзю, але і самымі рознымі юнакамі і дзяўчатамі, якія прыходзяць на нашы праекты і мерапрыемствы, таму што моладзь сёння мае дакладныя каштоўнасныя арыенціры, і пра гэта сведчаць у тым ліку і апытанні. Мы ў апошнія месяцы праводзілі апытанні разам з цэнтрам сацыяльных і палітычных даследаванняў БДУ наконт таго, якія каштоўнасныя арыенцыі пераважаюць у моладзевым асяроддзі. І ўпэўніліся, што, нягледзячы на скептычныя разважанні, моладзь ужо зусім не тая, што раней. Моладзь сёння ставіць прыярытэтамі свайго жыцця, у першую чаргу, здароўе, сям'ю, патрыятызм, грамадзянскую пазіцыю, любоў да Радзімы. Гэта ўсё становіцца важным акцэнтам і ў прыняцці рашэння падчас перадвыбарчай кампаніі, у прыняцці выбару, каго падтрымаць у дзень галасавання. Я больш чым упэўнены, што моладзь зробіць правільны выбар.

***— Паўмільёна маладых людзей — актыў БРСМ. На ваш погляд, гэта дастатковая лічба?***

— Статутам БРСМ закладзена тое, што наша дзейнасць ахоплівае не толькі саюзную моладзь, але і іншых маладых людзей. Мы сёння адкрыты для работы з любой моладдзю, любой грамадскай арганізацыяй, якая гатова супрацоўнічаць з БРСМ. Безумоўна, для нас прыярытэтам павінна быць як мага большая колькасць членаў арганізацыі, але гэта не самамэта. Задача нашага саюза — ахапіць канструктыўнай дзейнасцю як мага больш маладых людзей, і не прынцыпова, з'яўляюцца яны членамі нашай арганізацыі, ці не. Хоць, бясспрэчна, калі яны прымаюць удзел у нашых праектах, становяцца пастаяннымі ўдзельнікамі нашай работы, маладыя людзі прымаюць рашэнне, чаму б і не. Можна быць членам, напрыклад, экалагічнай арганізацыі і адначасова членам БРСМ.

*(Працяг будзе.)*

Гутарыла Святлана СУХАРКО.

# Беларусы з усіх сацыяльных інстытутаў найбольш давяраюць Прэзідэнту

**Сярод палітычных партый, грамадскіх, рэлігійных арганізацый высокі ўзровень даверу ў насельніцтва мае царква — 72,5% (у 2009 годзе — 78%).**

Як вы ацэньваеце палітычную абстаноўку ў Беларусі?

*(у % ад колькасці апытаных)*




Не карыстаюцца даверам у грамадзян перш за ўсё апазіцыйныя партыі — 66% адмоўных адказаў (за год доля грамадзян, якія далі негатыўныя ацэнкі, павялічылася на 9%) і прафсаюзы, якія не ўваходзяць у ФПБ, — 46% (47%).

Сярод праваахоўных, сілавых, кантралюючых, судовых органаў рэспублікі найбольшым даверам у грамадзян карыстаецца армія — 75% (год назад 82%). Далей ідзе Дзяржаўны пагранічны камітэт — 68% (у 2009 годзе — 73%).

За апошні год узровень даверу органам улады практычна не змяніўся. Найбольшы паказчык даверу Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь — 77,5%. Далей ідуць урад (Савет Міністраў) — 70% рэспандэнтаў, парламент (Нацыянальны сход) — 67,5%, мясцовыя органы ўлады — 56,5%.

Высокі ўзровень даверу кіраўніку дзяржавы пацвярджаюць наступныя звесткі. Большасць насельніцтва (77%) лічыць, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі Рэспубліка Беларусь развіваецца ў правільным кірунку. Сцвярджаюць, што дзейнасць цяперашняга Прэзідэнта адпавядае іх інтарэсам, 75% рэспандэнтаў.

Ул. інф.




# РАСКЛАД ЦЯГНІКОЎ У СВЯТЫ

**Прыгарадныя электрацягнікі са сталіцы ў кірунку Маладзечна, Баранавіч, Асіповіч і Оршы 24 і 31 снежня, а таксама 6 студзеня будуць курсіраваць па раскладзе пятніцы.**

25 снежня, 1, 7 і 8 студзеня па гэтых кірунках прыгарадныя саставы будуць хадзіць па раскладзе суботы, а 26 снежня, 2 і 9 студзеня — па раскладзе нядзелі. 24-26 і 30-31 снежня будзе прызначаны шэраг дадатковых цягнікоў з Мінска да Талькі, Пухавіч, Стоўбцаў, Оршы, Барысава і Маладзечна. 29 снежня ў 16.50 з Мінска ў Віцебск адпраўвіцца цягнік №118. 10 і 12 студзеня да паслуг пасажыраў прадугледжаны дадатковы цягнік № 437 Мінск — Брэст, які адпраўвіцца ў 0.35. Цягнік № 403 у тым жа кірунку пойдзе ў 11.40 7 снежня. На Маскву дадатковыя цягнікі прызначаюцца: № 208 — 18, 30-31 снежня (адпраўленне ў 21.47); № 502 — 31 снежня, 1-2 студзеня (адпраўленне ў 19.30); № 503 — 7, 9, 10 студзеня (адпраўленне ў 19.30).

Сяргей РАСОЛЬКА.

# ЭФЕКТ ПРЫСУТНАСЦІ

Сама па сабе традыцыя збіраць журналістаў ды міжнародных назіральнікаў у Палацы Рэспублікі і дзяліцца з імі свежай інфармацыяй пра ход галасавання — не новая. Аднак штосьці сёлета робіцца ўпершыню. Пра нованвядзенні распавёў на прэзентацыі інфацэнтра ЦВК яго кіраўнік, **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр СЛАБАДЧУК**. Тых, хто 19 снежня правядзе ў Палацы Рэспублікі, чакаюць, напрыклад, прамыя ўключэнні прадстаўнікоў абласных і сталічнага выбаркамаў. Тым жа, хто будзе далёка ад інфацэнтра, поўны эфект прысутнасці забяспечаны — дзякуючы онлайн-трансляцыям прэс-канферэнцый ЦВК на сайтах Цэнтральнай камісіі, Нацыянальнага прэс-цэнтра, Белтэлекама і БелТА. Увесь дзень галасавання яны будуць ісці ў рэжыме нон-стоп кожныя дзве гадзіны. Ад сябеададзім, што ўпершыню і wi-fi (бесправадны доступ у інтэрнэт) будзе бясплатны! Камп'ютараў, праўда, усяго 30, але ж хто цяпер без сваёй «друкарскай машынкі» ходзіць...

Больш як тысяча журналістаў з амаль 50 краін свету будзе інфармаваць сваіх чытачоў, гледачоў і слухачоў пра выбары прэзідэнта ў Беларусі. І айчынная палітычная падзея відавочна патрапіць у навіны не толькі ў нашых суседзяў ды ў краінах постсавецкай групы. Неабыякавыя да беларускай палітычнай сітуацыі літаральна ва ўсіх канцах свету: ЗША, Кітаі, Японіі, Венесуэле.

— Інтарэс да нашых выбараў вялікі, — канстатуе **дырэктар Нацыянальнага прэс-цэнтра Іван САКАЛОЎСКІ**.

У дзень выбараў інфацэнтр будзе працаваць ад раніцы і... да раніцы, відаць. На думку старшыні ЦВК, вялікая колькасць кандыдатаў падоўжыць працэдуру падліку галасоў. Калі раней закругляліся ў дзвятры гадзіны ночы, то сёлета, пры наяўнасці ажно 10 кандыдатаў, чакаць папярэдніх вынікаў, відаць, будзем да світання...

### Драмы больш у інтэрнэце

За тры дні датэрміновага галасавання выбарчыя ўчасткі наведала ўжо 11,7 адсотка выбаршчыкаў. **Старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА** назвала гэты паказчык традыцыйным для нашай краіны. Што да заўваг адносна правядзення датэрміновага галасавання, то, на яе думку, «усе драмы развіваюцца больш у інтэрнэце, чым на самай справе». Кіраўнік Цэнтрвыбаркама дадала, што ёсць спробы дыскрэдытаваць выбары, сарваць работу выбарчых камісій. Паводле яе звестак, ёсць нават участкі, дзе ўжо тры дні мэтанакіравана чыняцца скандалы і правакацыі. «На шчасце, такіх участкаў няшмат», — адзначае Л. Ярмошына.

Паведаміла яна і пра акты некаторых назіральнікаў, якія паступілі ў ЦВК. Усе яны, паводле слоў кіраўніка Цэнтрвыбаркама, зводзяцца да аднаго — скаргі на тое, што назіральнікам не дазваляюць начаваць на выбарчых участках.

— Усе спробы застацца на ноч (на выбарчых участках. — **Аўт.**) — не больш, не менш, як запланаваная правакацыя, — пераканаая спадарыня Ярмошына. — Людзі, якія гэта робяць, ведаюць, што гэта незаконна.

Яна нагадала пра тое, што нядаўна гэта пытанне разглядалася на пасяджэнні ЦВК і Цэнтральная камісія прыняла прынцыповае адмоўнае рашэнне.

Прэтэнзіі наконт таго, што бюлетэні ў час датэрміновага галасавання падмяняюцца, старшыня Цэнтральнай камісіі назвала «стандартным абвінавачваннем» і «адным з міфаў нашай выбарчай кампаніі».

— Нічога на выбарчых участках не адбываецца. Усё запіраецца, заклейваецца, закрываецца ў прысутнасці назіральнікаў і бярэцца пад ахову міліцыі, — супакойвае выбаршчыкаў кіраўнік ЦВК, мяркую, што ўжо можа быць больш надзейным...

Паступілі ў Цэнтрвыбаркам і два звароты, дзе паведамляецца пра прымус да датэрміновага галасавання. Яны цяпер правяраюцца. Адсутнасць жа нейкіх іншых нараканняў дазваляе кіраўніцтву ЦВК з задавальненнем гаварыць пра тое, што кампанія праходзіць «у звычайным штатным рэжыме, досыць спакойна, хоць ёе і спрабуюць раскачаць некаторыя кандыдаты і іх прыхільнікі». Не абышлося і без згадвання празрыстых скрыняў. Імі, дарэчы, абсталяваных амаль 600 з больш як шасці тысяч участкаў.

### Апытанні на выхадзе

З санкцыі ЦВК праводзіць экзіт-полы (апытанне на выхадзе з участка) на гэтых выбарах будуць тры сацыялагічныя службы: «ЕсооМ», Беларускі камітэт моладзевых арганізацый і ўкраінская «TNS». Лідзія Ярмошына акцэнтавала, што Цэнтрвыбаркам не рэкамендуе публікаваць вынікі падобных апытанняў на працягу дня галасавання, паколькі гэта ўплывае на волевыяўленне выбаршчыкаў і ня ярэдка расцэньваецца кандыдатамі як агітацыя. А яна ў дзень выбараў, нагадаем, забароненая. Аднак у Цэнтрвыбаркаме лічаць за лепшае арыентавацца па абставінах:

— Калі пачнецца ўкід несапраўднай інфармацыі пра вынікі экзіт-полаў, гэта будзе вымушаная неабходнасць — даваць іншую інфармацыю, каб не было дамінавання негатыўнай незаконнай інфармацыі, — падкрэслівае Л. Ярмошына.

### Правілы для назіральнікаў змяняцца не будуць

Адказваючы на пытанні журналістаў падчас прэзентацыі інфацэнтра, старшыня ЦВК пацвердзіла, што «на жаль, такія факты, калі назіральнікі вядуць сябе, як гаспадары, ёсць». А нахабнікаў, паводле цвёрдага перакання Лідзіі Ярмошынай, «трэба ставіць на месца». Аднак «правілы для назіральнікаў змяняцца не будуць», — падкрэслівае старшыня Цэнтрвыбаркама. Яны ўстаноўленыя законам, і змяніць іх за дзень да выбараў ніхто не ўпаўнаважаны.

Нагадала Лідзія Ярмошына і пра тое, што 19 снежня пасля закрыцця ў 20.00 участкаў для галасавання ў краіне ўжо не будзе асоб са статусам кандыдатаў у прэзідэнты. «Калі, вядома ж, не будзе прызначаны другі тур». Адпаведна, паведамлены парадак правядзення масавых мерапрыемстваў (пры якім не патрэбны спецыяльны дазвол) на гэты час ужо не распаўсюджваецца. Пры жаданні арганізаваць нейкае масавае мерапрыемства ў сталіцы ў гэты час ахвотнікі павінны былі ва ўстаноўленым парадку, за 15 дзён звярнуцца ў Мінгарвыканкам.

— Ніводная арганізацыя з падобнай просьбай у Мінгарвыканкам не звярталася, — падкрэслівае Л. Ярмошына.

Яна таксама нагадала, што забарона на правядзенне масавых мерапрыемстваў менавіта на Кастрычніцкай плошчы ўведзена яшчэ ў 1990-я гады. І ніякіх двайных стандартаў, паводле яе слоў, няма:

— Нават улада не праводзіць тут мерапрыемствы грамадска-палітычнага значэння, — сцвярджае старшыня ЦВК.

Забарона, мяркую, аднолькавая для ўсіх...

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## Віншаванне Прэзідэнта

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча з 80-годдзем з дня заснавання аркестра.**

«Творчасць вашага славутага калектыву ўвабрала ў сябе самыя лепшыя традыцыі і дасягненні беларускага мастацтва, — гаворыцца ў віншаванні. — Упэўнены, што творчая дзейнасць аркестра і далей будзе такой жа плённай і паспяховай, напоўненай няспынным мастацкім пошукам, новымі дасягненнямі, цікавымі канцэртнымі праграмамі і ўвагай удзячнай публікі».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў калектыву здароўя, творчых поспехаў, невычэрпнага натхнення, шчасця і добрага настрою.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## БАТЭ супраць французскага ПСЖ

### Прайшла жараб'ёўка плэй-оф Лігі Еўропы

Учора ў швейцарскім Ньоне адбылася жараб'ёўка 1/16 і 1/8 фіналу Лігі Еўропы. Супернікам нашага прадстаўніка, барысаўскага БАТЭ, у плэй-оф другога па значнасці еўратурніру стане французскі клуб «Пары Сен-Жэрмен». Першую сустрэчу БАТЭ правядзе дома 17 лютага, другую — на выездзе 24-га. Калі нашаму чэмпіёну ўдасца прайсці далей, яго супернікам стане пераможца пары «Бенфіка» — «Штутгарт».

Вось як выглядаюць астатнія пары:

Бешыкташ (Турцыя)/Дынама (Кіеў, Украіна) — Арыс (Грэцыя)/Манчэстэр Сіці (Англія)

Рубін (Расія)/Твентэ (Галандыя) — Янг Бойз (Швейцарыя)/Зеніт (Расія)

ПАОК (Грэцыя)/ЦСКА (Расія) — Севілья (Іспанія)/Порту (Партугалія)

Ліль (Францыя)/ПСВ (Галандыя) — Рэйнджэрс (Шатландыя)/Спортынг (Партугалія)

Металіст (Украіна)/Баер (Леверкузен) — Напалі (Італія)/Вільярэал (Іспанія)

Андэрлехт (Бельгія)/Аякс (Галандыя) — Базэль (Швейцарыя)/Спартак (Масква, Расія)

Спарта (Чэхія)/Ліверпуль (Англія) — Лех (Польшча)/Брага (Партугалія).

Матчы пройдуць 10 і 17 сакавіка.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## САЧЫЎ ЗА ПЕНСІЯНЕРКАЙ АД БАНКА

**Зламыснік зацікавіўся жанчынай, якая ў касе аддзялення аднаго з банкаў у Мінску атрымала грошы, і вырашыў адняць у яе ўсю суму.**

Каб ажыццявіць задуманае злачынства, паводле звестак прэс-афіцэра Ленінскага РУУС Сяргея Козела, 21-гадовы жыхар сталіцы пайшоў за пенсіянеркай, а пасля разам з патэнцыйнай ахвярай зайшоў у пад'езд аднаго з дамоў па вуліцы Пляханава. У пад'ездзе нахабнік сілай вырваў з рук жанчыны дамскую сумку, у якой ляжала 450 тысяч рублёў. Між іншым, гэтыя грошы ён перад тым, як яго затрымалі праваахоўнікі, паспеў патраціць на набыццё зімовай курткі і штаноў, а астатнія прайграў у гульнявых аўтаматах. У дачыненні падазронага заведзена крымінальная справа за рабаўніцтва, яму пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Тваё правы

# «КАНТРАКТНЫ» ВОДПУСК МОЖА ВЯРНУЦЬ СУД

**Практыка заключэння працоўных кантрактаў стала папулярнай вось ужо больш чым дзесяць гадоў таму, і тым не менш гэтая тэма застаецца па-ранейшаму на слыху. Пры якіх умовах магчымае заключэнне кантрактаў менш чым на год, з якімі катэгорыямі работнікаў пры іх жаданні абавязаны працягваць кантракты і што рабіць, калі працадаўца «забываецца» павялічыць тарыфную стаўку ці аклад і даць дадатковыя дні водпуску — вось толькі некаторыя па-сапраўднаму «вострыя» пытанні. І разабрацца з імі мы паспрабуем з дапамогай <u>галоўнага спецыяліста юрыдычнага аддзела камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Наталлі Іванаўны ЯСІНСКАЙ</u>.**

### НЕ МЕНШ ЗА ГОД. І ВЫКЛЮЧЭННЕ З ПРАВІЛА

*Пра тое, што максімальны тэрмін кантракта складае пяць гадоў, а мінімальны — год, ведае ці не кожны. Пытанне ўзнікае з іншым: ці можа наймальнік прапанаваць кантракт, скажам, на паўгода ці на 9 месяцаў?*

— Калі гаворка ідзе пра заключэнне новага кантракта, то адназначна — не, — распавядае Наталля Ясінская. — Крыху іншая сітуацыя — працяг кантракта. Тут тэрмін можа быць меншым за год. Але пры адной вельмі істотнай умове — на гэта пісьмова пагаджаецца сам работнік.

### ХТО НЕ ПРАЙШОЎ ВЫПРАБАВАННЕ?

*З аднаго боку, пры прыёме на працу наймальнік абавязаны заключыць новы кантракт не менш чым на год. А з другога — той жа наймальнік мае намер вызначыць выпрабавальны тэрмін, які не можа перавышаць тры месяцы. Што будзе ў выпадку, калі работнік выпрабаванне не пройдзе?*

— Тут павінен заключацца кантракт не менш чым на год, але ў кантракце пазначаецца ўмова выпрабавання, — тлумачыць Наталля Ясінская. — І калі работнік выпрабаванне не праходзіць, нішто не перашкаджае наймальніку кантракт скасаваць — як у апошні дзень выпрабавання, так і раней. Адно, што скасаванне кантракта раней заканчэння выпрабавальнага тэрміну робіцца з пісьмовым папярэджаннем за тры дні. Такія ж магчымасці спынення дзеяння кантракта ёсць і ў работніка, які знаходзіцца на выпрабаванні.

### ПЕРШЫ КРОК — КАМІСІЯ

Катэгорыі работнікаў, з якімі заключэнне кантрактаў немагчымае, наша заканадаўства не вызначае. Па сутнасці, кантракт можа быць прапанаваны кожнаму. Абавязковай умовай для ўсіх тут з'яўляецца вызначэнне работніку павелічэння тарыфнай стаўкі да 50 працэнтаў і даванне таму ж работніку ад 1 да 5 дадатковых дзён водпуску. Гэта патрабуе заканадаўства. Але так бывае не заўсёды.

— Калі работніку не прапаноўваюцца павышэнне тарыфнай стаўкі і дадатковыя дні водпуску, то праблему лепш за ўсё вырашаць праз камісію па працоўных спрэчках у сваёй жа арганізацыі, — раіць Наталля Ясінская. — Калі ж такой камісіі няма, то можна звярнуцца ў суд. Прычым плаціць судовую пошліну ў такім выпадку не давядзецца.

*(Працяг будзе.)*

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

◢ **Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі ў навучэнца Бярозаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага ліцэя партыю піратэхнічных вырабаў, якія ён захоўваў з парушэннем правілаў абыходжання з прадметамі такога роду. Ён захоўваў піратэхніку ў пакоі свайго інтэрната. У яго канфіскавана 800 вырабаў імпартнай вытворчасці агульным коштам Br2,7 млн. Праводзіцца праверка.**

◢ Жыхар Баранавічаў пад пагрозай прымянення сілы спрабаваў завалодаць выручкай залы гульнявых аўтаматаў на вуліцы Багдановіча ў Мінску — больш за Br10 млн. Нарад міліцыі затрымаў яго на месцы злачынства. Высветлілася, што гэты 30-гадовы беспрацоўны ўжо быў судзімы за крадзеж.

◢ **У Польшчы сёлета ў лістападзе—снежні ад пераахалджэння памерлі ўжо 87 чалавек. Між тым, тэмпература паветра на гэтым тыдні знізілася там да 15-20 градусаў і істотнага пацяплення не чакаецца.**

## Поўны абзац

◢ У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах устанавілі самую дарагую калядную ёлку ў свеце — са сваім уборам яна каштуе больш за $11 млн. Святочнае дрэва вышынёй 13 м упрыгожылі не толькі звычайнымі цацкамі, але і ювелірнымі вырабамі: на галінках развешаны бранзалеты, каралі і гадзіннікі, інкруставаныя брыльянтамі, смарагдамі, сапфірамі і іншымі каштоўнымі камянямі. Такім чынам уладальнікі шыкоўнага атэля ў Абу-Дабі спадзяюцца прыцягнуць пабольш гасцей на навагодні святы. Непадалёк устаноўлены аўтамат, што гандлюе залатымі зліткамі. Для ўпрыгажэння дрэва быў выкарыстаны 181 каштоўны камень.

◢ **У польскім горадзе Бялаград мясцовы паліцэйскі аштрафаваў сам сябе, каб выканаць... план! Анджэй Т. вырашыў выпісаць сабе штраф, паколькі кіраўніцтва патрабуе, каб быў хоць адзін штраф у дзень. У выніку невыканання прадпісання мясцовым паліцэйскім «свецяць» скарачэнне зарплаты. Не доўга думаючы, вартавы парадку выпісаў сабе штрафную квітанцыю «за хаджэнне па чыгуначных пуцях». Анджэй аштрафаваў сябе на 20 злотых, пра што стала вядома калегам. Нешта нам гэта нагадвае, ці не так?**

◢ У Канадзе невядомыя абрабавалі краму бясплатных тавараў. Два злодзеі вынеслі адтуль усё, што трапілася пад рукі. Аказалася, што абрабавалі яны краму, дзе кожны ахвотны можа абсалютна бясплатна браць усё, што яму спадабаецца. Уладальнікі крамы заўважылі, што не варта было рызыкаваць і лезці ноччу ў памяшканне — дастаткова было прыйсці ў працоўны час і ўзяць любы тавар. Яшчэ б і дзякуй сказалі. Дарэчы, такая ж бясплатная крама адчыненая сёлетнім маем і ў Новай Зеландыі.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# СЛАВЯНСКАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

**Падабенства моў, культур, нават ментальнасці — вось той натуральны каркас, на якім здавён-даўна грунтуецца славянскае задзіночанне. Чым выклікана і як трансфармуецца гэтая кансалідацыя сёння, абмяркоўваем з <u>Сяргеем КАСЦЯНАМ, старшынёй Беларускага славянскага камітэта</u>. А падзеліцца яму, дарэчы, ёсць чым — не так даўно сустракаўся з аднадумцамі падчас чарговага Усеславянскага з'езда. Дзясятая, юбілейная, сустрэча прадстаўнікоў супольнасці, якая сабрала больш як тысячы сотні дэлегатаў з 14 славянскіх краін, вызначылася шэрагам адметнасцяў.**

— Упершыню прыняты Статут Міжнароднага Славянскага Камітэта, — кажа наш суразмоўца. — Цяпер міжнародны славянскі рух будзе кіравацца ўжо статутнымі палажэннямі, усё прыведзена ў сістэму. Нормы, закладзеныя ў дакументы, дазваляюць больш канкрэтна і актыўна садзейнічаць славянскаму задзіночанню. Было таксама прынятае рашэнне абвесціць налета год сусветнай славянскай культуры.

Менавіта цяпер яна, на думку спадара Касцяна, як ніколі мае патрэбу ў падтрымцы:

— Паглядзіце, у якім найскладанейшым становішчы сёння сербы, македонцы, дзе ідзе бязлітаснае наступленне на славянскую культуру... Калі меркаваць па тэлеканалах (а я меў магчымасць глядзець не толькі айчыннае тэлебачанне, але і тое, што прапануюць сваім гледачам у Балгарыі, Сербіі, Чэхіі), ідзе наступленне заходняй ды афрыканскай мас-культур на славянскую. Яны далёкія ад нашага менталітэту, гісторыі, традыцый і звычаяў. І ёсць вялікая патрэба ахоўваць, падтрымліваць сваю культуру, прыцягваць да яе ўвагу. Наступны год адзначыцца мноствам цікавых мерапрыемстваў. Ідэй уво багата. На нас выйшлі дзеячы культуры Славакіі, Польшчы. Сваё бачанне таго, як правесці гэты год культуры, мае Украіна. Шмат у гэтым кірунку таксама робіць Чэхія. Палякі прапанавалі правесці ў сябе Фестываль славянскай паэзіі. Мы яшчэ з нашым Міністэрствам культуры будзем абмяркоўваць, што можам прапанаваць. Але ж праводзіла Беларусь, напрыклад, дзіцячае «Еўрабачанне», дык чаму б нам не наладзіць славянскі конкурс дзіцячай песні? А наша Акадэмія навук прапануе арганізаваць з'езд даследчыкаў-славянафілаў. Задум — хоць адбаўляй! Такі культурны, навуковы абмен будзе садзейнічаць збліжэнню славян з розных куткоў свету, дазволіць нам больш даведацца адно пра аднаго.

Паводле ўражанняў спадара Касцяна, неабходнасць яднацца славяне пачынаюць усведамляць і на ўрадавым узроўні. Не толькі гуманітарныя праекты абмяркоўваліся на з'ездзе, гутарка вялася і пра эканоміку:

— Літаральна ўсе дэлегаты (а там жа найразумнейшыя людзі збіраюцца — паслы, міністры, парламентарыі, акадэмікі, — якія ўплываюць і працягваюць уплываць на грамадскую сітуацыю ў сваіх краінах) адзначалі ў сваіх выступленнях пазітыўны ўплыў эканамічнай мадэлі Беларусі і ролю ў гэтым нашага Прэзідэнта, — расказвае Сяргей Касцян. — Такая высокая ацэнка сусветнай славянскай супольнасці пра многае кажа. Беларусь можа зрабіць вялікі ўнёсак у славянскую супольнасць. Сваёй стабільнасцю, падтрымкай славянскіх дзяржаў, у тым ліку на міжнароднай арэне, сваёй эканамічнай мадэллю. Крызіс паказаў, што наша сацыяльна-эканамічная мадэль моцная, апрабаваная часам. Беларусь не прывязала сябе цалкам ні да долара, ні да еўра, а з дня ў дзень умацоўвала нацыянальную валюту. Менавіта таму мы выстаялі.

*(Працяг будзе.)*

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

**Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых полисов** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории стран — членов системы «Зеленая карта» серии BY01 № 3471890 и обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС № 0076100 **считать недействительными.** УНП 101883943

Кіраўнікі абедзвюх міжнародных назіральных місій дзеляцца сваімі развагамі пра бягучыя выбары з чытачамі «Звязды»

«Узброеным» вокам

# ДВУХБАКОВЫ БЕССТАРОННЫ ПОГЛЯД

**З абвяшчэння даты выбараў мы ўвесь час спрабавалі залучыць вас, шаноўныя чытачы, у гэты працэс: паглядзіце, вунь здарылася гэтае, тут адбылося тое... Як маглі, стваралі эфект прысутнасці, намагаліся зрабіць вас удзельнікамі падзей — як-ніяк выбары робяцца для вас. Вы чыталі праграмы патэнцыйных прэзідэнтаў і выступленні арганізатараў электаральнага працэсу. Сёння ж мы зменім ракурс. Паспрабуем паглядзець на сітуацыю звонку. Вокам, узброеным бесстароннасцю, кампетэнтнасцю, праніклівасцю і, што самае галоўнае, незацікаўленасцю ў зыходзе справы. Такімі вачыма на прэзідэнцкія выбары ў Беларусі могуць глядзець, бадай, толькі міжнародныя назіральнікі. І зараз у дасведчанага чытача «Звязды» ёсць эксклюзіўная магчымасць зірнуць на гісторыю, якая ствараецца ўжо сёння, іх вачыма.**

## З пункту гледжання кіраўніка назіральнай місіі АБСЕ/БДІПЧ Герта АРАНСА



***— З удзельнікамі перадвыбарчай гонкі Вы, спадар Аранс, сустракаліся асабіста, адчулі моцную спаборнасць?***

— Зыходзячы з тых заяў, якія робяць кандыдаты, і з нашых уласных меркаванняў, можна зрабіць выснову, што ў кандыдатаў досыць разнастайныя падыходы і меркаванні. Сутнасць выбараў і заключаецца ў тым, каб у электарату заўжды была пэўная магчымасць выбару. Пра меркаванне народа мы даведаемся, калі будуць аб'яўлены вынікі выбараў. Аднак для нас вынік не з'яўляецца найважнейшым паказчыкам. Нам важнае назіранне за самім працэсам, паколькі нашай задачай з'яўляецца яго ацэнка ў адпаведнасці з тымі абавязацельствамі, якія мае Беларусь у складзе АБСЕ — і гэта ўсё.

***— Наколькі шырокія магчымасці для агітацыі і ці ў поўнай меры, паводле Вашага ўражання, кандыдаты імі карыстаюцца?***

— Я лічу, што кандыдаты карыстаюцца ўсімі магчымасцямі, якія ім даюцца. Што датычыцца эфірнага часу на радыё і тэлебачанні, у іх была магчымасць выступаць да трэцяга снежня. Аднак пасля гэтага на тэлебачанні асвятляецца пераважна дзейнасць Прэзідэнта. Мы назіралі таксама і за сустрэчамі з выбаршчыкамі, і за іншымі акцыямі. Яны прайшлі без якіх-небудзь перашкод, за выключэннем некаторых скаргаў наконт адведзеных памяшканняў. Аднак мы з радасцю адзначаем дзве важныя, на наш погляд, пазітыўныя змены. Па-першае, кандыдаты маглі ўжывую звярнуцца да выбаршчыкаў праз СМІ — без цэнзуры і папярэдняга мантажу. Па-другое, яны маглі праводзіць мерапрыемствы без спецыяльнага дазволу ўлад — дастаткова было проста папярэдзіць.

***— Упершыню за 16 гадоў у Беларусі прайшлі тэледэбаты кандыдатаў у Прэзідэнты. На Вашу думку, гэта эфектыўная форма агітацыі?***

— Дэбаты — гэта вельмі важны і цікавы спосаб для кандыдатаў данесці свае ідэі. Мне падабаюцца цікавыя і дынамічныя перадачы такога плана, і я, натуральна, глядзеў беларускія тэледэбаты. Але ж на маю думку, яны былі б больш цікавымі, калі б у іх браў удзел Прэзідэнт.

***— Ёсць і яшчэ адно немалаважнае новаўвядзенне сёлетніх выбараў — асабістыя фінансавыя фонды кандыдатаў. Істотна яны паўплывалі на агітацыю?***

— Паколькі раней фінансаванне здзяйснялася выключна за кошт датацый дзяржавы, то гэтае новаўвядзенне, зразумела, з'яўляецца дадатковай магчымасцю фінансавання выбарчай кампаніі, няхай і абмежаваным чынам. Тым не менш, устаноўлены ліміт фондаў не дазваляе гаварыць пра тое, што іх сродкі можна выкарыстоўваць для поўнамаштабнай перадвыбарчай кампаніі. Аднак у любым выпадку гэта крыху больш, чым раней. Я не кажу, што сродкаў недастаткова. Проста памеры фондаў малыя.

***— А колькі, Вы лічыце, грошай трэба для поўнамаштабнай кампаніі?***

— Вельмі цяжка гаварыць, колькі сродкаў спатрэбіцца для паўнаважкай перадвыбарчай кампаніі — усё залежыць ад умоў канкрэтнай краіны. А яны пасусль адрозніваюцца, нават калі параўноўваць краіны ўнутры АБСЕ. Важна зразумець, ці адпавядае становішча кандыдатаў тым абавязацельствам, якія мае Беларусь у складзе АБСЕ. І самым галоўным прынцыпам тут з'яўляецца роўнасць умоў для ўсіх кандыдатаў.

***— Як ацэньваеце ход датэрміновага галасавання?***

— Для нас гэта таксама свайго роду наваўвядзенне, што кароткатэрміновыя назіральнікі вядуць маніторынг за некалькі дзён да дня галасавання. Яны прыступілі да гэтага толькі пазаўчора, таму пакуль рана рабіць нейкія высновы. Аднак відавочна, што ў некаторых установах прыкладаюцца пэўныя намаганні да таго, каб супрацоўнікі прагаласавалі менавіта датэрмінова. Я пакінуў бы гэта на меркаванне выбаршчыкаў — галасаваць ім загадзя ці ў дзень выбараў, а не схіляць, скажам, студэнтаў да таго, каб яны прагаласавалі датэрмінова і тым самым атрымалі дадатковы выхадны. З іншага боку, важна разумець, што гэта не з'яўляецца сур'ёзным парушэннем, калі працэс датэрміновага галасавання адпавядае ўсім патрабаванням бяспекі і празрыстасці. І сёлета якраз былі ўведзены дадатковыя меры бяспекі (заклейванне прарэзі ў скрынях не толькі ў канцы кожнага дня датэрміновага галасавання, але і на дзве гадзіны перапынку ў сярэдзіне дня, а таксама захоўванне спісаў выбаршчыкаў ды бюлетэняў у сейфах ці металічных шафах у непрацоўны час. — **Аўт.**). Гэта той самы аспект папярэдняга галасавання, на які будзе звернута асаблівая ўвага ў рамках нашага сістэмнага назірання за гэтым працэсам.

***— Ці адчуваеце заяўленую Цэнтрвыбаркамам лібералнасць падчас бягучай кампаніі?***

— Гэта, безумоўна, пазітыўнае сцвярджэнне... калі яно прывядзе да рэалізацыі. І ў маіх словах няма іроніі. Але мы ведаем, што такое бюракратыя (не толькі ў Беларусі, ва ўсіх краінах свету). Дзяржаўны апарат не такі рухомы, як хацелася б, і, каб падлік галасоў стаў празрыстым, патрэбны шэраг пэўных рухаў унутры самога механізму. Таму цяпер усё зводзіцца да таго, што некаторым кіраўнікам мясцовых выбарчых камісій, якія займаюцца гэтым, магчыма, ужо не адзін дзясятак гадоў, давядзецца, па сутнасці, вучыцца новым «фокусам».

***— Сёлетнія прэзідэнцкія выбары называюць беспрэцэдэнтнымі ўжо хоць бы таму, што ўпершыню ў беларускай гісторыі такая колькасць кандыдатаў...***

— У сваёй практыцы я не назваў бы гэтыя выбары беспрэцэдэнтнымі. Напрыклад, на Украіне у 2004 годзе ў спісе кандыдатаў было больш за 20 чалавек. Але ў любым выпадку да другога раўнда ўсё заўжды зводзіцца да двух кандыдатаў. Зразумела, у параўнанні з папярэднімі прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі, розніца ёсць. Тады я сустракаўся з трыма кандыдатамі і адным кіраўніком выбарчага штаба, сёлета — з дзевяццю кандыдатамі і адным кіраўніком штаба. Мы лічым гэта дастатковай інклюзіўным працэсам (той, што распаўсюджваецца на больш шырокае кола прадметаў. — **Аўт.**), што з'яўляецца пазітыўным індыкатарам для нас. Роўна як і тое, што ў рамках гэтай выбарчай кампаніі кандыдаты могуць праводзіць мерапрыемствы без папярэдняга ўзгаднення. А таксама магчымасць прамога эфіру пры звароце да аўдыторыі праз тэлебачанне і радыё. У заканадаўства былі ўнесены некаторыя станоўчыя змены. Працэдура збору подпісаў прайшла свабодна. Працэс рэгістрацыі быў цалкам інклюзіўным. Гэта тыя моманты, якія я адзначыў бы як станоўчыя. Але ж ведама, вельмі важным будзе тое, што мы ўбачым у нядзелю, асабліва пасля закрыцця выбарчых участкаў.

***— Падлік галасоў па-ранейшаму застанецца для місіі АБСЕ вырашальным фактарам?***

— Усё будзе залежыць ад таго, як ён пройдзе. Два гады таму падлік галасоў насамрэч быў адным з самых важных, вырашальных, фактараў, паколькі ў нас была вялікая колькасць справаздач нашых назіральнікаў, дзе працэдура падліку галасоў ацэньвалася «дрэнна» ці «вельмі дрэнна». І выклікана гэта было пераважна адсутнасцю празрыстасці працэсу. Назіральнікаў прасілі адысці падалей ад месца, дзе падлічваліся галасы, і яны не бачылі насамрэч, што ўяўляе сабой гэта працэдура. Спадзяюся, нядаўняя пастанова ЦВК (дзе гаворыцца, што ў назіральнікаў павінна быць рэальная магчымасць непасрэдна назіраць за працэдурай падліку галасоў) прывядзе да таго, што кіраўнікі мясцовых выбарчых камісій створаць неабходныя ўмовы для таго, каб назіральнікі маглі сапраўды назіраць за падлікам галасоў. Паглядзім у нядзелю вечарам, як гэта працуе. Для нас вельмі важна менавіта тое, што адбываецца ў сам дзень выбараў і непасрэдна пасля закрыцця выбарчых участкаў. Менавіта гэтыя пытанні пераважна і выклікалі негатыўную ацэнку, якая ўтрымлівалася ў выніковых справаздачах у 2006 і 2008 гадах. І мы працягваем гаварыць пра гэта, паколькі выбары могуць прайсці належным чынам толькі ў тым выпадку, калі выбарчыя органы ведаюць пра гэта.

***— Калі б у апісанні бягучых выбараў Вы былі абмежаваны літаральна некалькімі словамі, што сказалі б?***

— Гэта ўсё яшчэ не роўнае поле...

***— Але ж увогуле спадзяецеся на лепшае ў асноўны дзень галасавання?***

— Магу сказаць вам, што я сапраўды сімпатызую гэтай краіне, і гэта не проста формула ветлівасці. Я буду толькі рад, калі па выніках сёлетніх выбараў мы зможам даць лепшую ацэнку, чым два папярэднія разы. Аднак гэта залежыць не ад мяне, а ад тых, хто праводзіць выбары. Часам здаецца, што людзі думаюць, нібыта раніцай у панядзелак спадар Аранс бярэ лісток паперы і піша «Гэтыя выбары былі дрэннымі, кропка». Насамрэч у панядзелак мы будзем знаходзіцца на вяршыні піраміды справаздач. Да таго ж, ёсць яшчэ дэлегацыя ПА АБСЕ пад кіраўніцтвам спадара Тоні Лойда. І ў панядзелак мы разам абмяркуем і ўзгоднім, што нам варта сказаць у ацэнцы гэтых выбараў.

Ала МАЧАЛАВА.

## З пункту гледжання кіраўніка назіральнай місіі СНД Сяргея ЛЕБЕДЗЕВА



***— Якія Вашы ўражанні, Сяргей Мікалаевіч, ад сустрэч з кандыдатамі? Ці вострая спаборнасць?***

— Прадстаўнікі Штаба Місіі назіральнікаў ад СНД сустрэліся з сямю кандыдатамі ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь ці іх даверанымі асобамі. Безумоўна, усе сустрэчы былі для нас вельмі пазнавальныя і карысныя. Падчас іх мы расказвалі кандыдатам пра нашу работу, яны дзяліліся сваімі ўражаннямі пра ход выбарчай кампаніі.

Даваць ацэнку кандыдатам ці вылучыць некага з іх я, натуральна, не магу, бо, як міжнародны назіральнік, павінен прытрымлівацца прынцыпаў бесстароннасці і нейтральнасці. А пра ступень канкурэнцыі вам лепш запытацца ў саміх кандыдатаў.

***— Наколькі яркая і прыкметная агітацыя, паводле Вашых уражанняў? Ці адчувальная наяўнасць асабістых фінансавых фондаў кандыдатаў?***

— Усю агітацыю, на мой погляд, можна ўмоўна падзяліць на дзве групы — тая, якая вялася ў рамках пастановы Цэнтрвыбаркама «Аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2010 годзе», і ўся астатняя інфармацыя пра кандыдатаў, што з'яўлялася ў розных СМІ.

Што датычыць першай часткі, то ўсім кандыдатам было дадзена права бясплатна апублікаваць сваю перадвыбарчую праграму ў чатырох рэспубліканскіх (сярод якіх была і «Звязда») і сямі рэгіянальных газетах. Наколькі нам вядома, гэтым правам скарысталіся ўсе. Праўда, паводле нашай інфармацыі, у некаторых кандыдатаў пры гэтым узніклі невялікія праблемы. Аднак усе пытанні былі паспяхова вырашаны ў рабочым парадку, у тым ліку дзякуючы аператыўнаму ўмяшанню ЦВК.

Цалкам было выканана і патрабаванне заканадаўства аб прадстаўленні кандыдатам магчымасці двойчы выступіць у тэле- і радыёэфіры. Ёю скарысталіся дзевяць і сем кандыдатаў адпаведна.

На тэлебачанні і радыё ўпершыню за многія гады прайшлі дэбаты кандыдатаў у прэзідэнты. Я сам глядзеў тэледэбаты чацвёртага снежня і бачыў, што шэраг кандыдатаў скарыстаў гэтую магчымасць для дастаткова вострай крытыкі ўлад.

Назіральнікі ад СНД з 18 лістапада праводзілі маніторынг праграм навін на трох вядучых беларускіх тэлеканалах — Першым нацыянальным, АНТ, СТВ, найбуйнейшых рэспубліканскіх і недзяржаўных газет, у тым ліку ў лічбавых версіях, найбольш папулярных інтэрнэт-рэсурсаў навін.

Сцісла па выніках маніторынгу можна адзначыць, што ў тэленавінах і рэспубліканскіх друкаваных выданнях часцей за іншых фігураваў А.Р. Лукашэнка, аднак яго работа асвятлялася як дзейнасць дзейнага Прэзідэнта, а не кандыдата. Хацеў бы заўважыць, што пераважная прысутнасць дзейнага лідара на старонках газет і ў эфіры цалкам натуральная. Я меў магчымасць назіраць за выбарамі ў ЗША, краінах Заходняй Еўропы і, вядома ж, СНД і павінен сказаць, што ў такіх выпадках назіраецца абсалютна аналагічная карціна.

Адносны баланс прысутнасці кандыдатаў захоўваўся ў інтэрнэце. Пры гэтым на адным з найбуйнейшых інфармацыйных парталаў у рэжыме он-лайн былі праведзены дэбаты кандыдатаў у прэзідэнты.

Магчымасць адкрыцця рахункаў выбарчага фонду кандыдатаў з'яўляецца яшчэ адным новаўвядзеннем прэзідэнцкіх выбараў-2010. Сабраныя сродкі можна было выкарыстоўваць, у тым ліку, на аплату эфірнага часу і друкаванай плошчы ў СМІ, публікацыю агітацыйных матэрыялаў.

***— Вы прыгадалі тэледэбаты. Яны, на Ваш погляд, акажуць сур'ёзны ўплыў на рэйтынг удзельнікаў? Наколькі ўвогуле важкая роля масмедыя ў агітацыі?***

— Ва ўсім свеце сродкі масавай інфармацыі з'яўляюцца наймагутнейшым агітацыйным рэсурсам, і Беларусь у гэтым плане — не выключэнне. Першым каналам камунікацыі з'яўляецца тэлебачанне, на другім месцы — газеты і інтэрнэт, на трэцім — радыё. Вядома ж, асабістыя сустрэчы з выбаршчыкамі — таксама вельмі дзейсны і важны момант агітацыі, але любы з кандыдатаў проста фізічна не ў стане пабачыцца з усім электаратам. Да таго ж, сустрэчы часцей за ўсё праходзяць у рэжыме «пытанне-адказ». Праз СМІ ж працэй за ўсё данесці сваю перадвыбарчую праграму. Нельга забывацца і пра галоўную задачу сродкаў масавай інфармацыі — аператыўнае асвятленне падзей, у тым ліку звязаных з выбарчай кампаніяй. Наколькі мне вядома, у дзень галасавання ў Беларусі будзе працаваць каля тысячы журналістаў.

Дэбаты — гэта, безумоўна, значны крок наперад у правядзенні дэмакратычных, свабодных выбараў. Яны патрэбныя ў першую чаргу простым выбаршчыкам, каб зразумець, хто з кандыдатаў ім бліжэй па поглядах. Я, напрыклад, з інтарэсам назіраў за дэбатамі. А вось наколькі эфектыўным і ўдалым быў удзел у іх кандыдатаў, мы зразумеем па выніках выбараў.

***— Як Вы ацэньваеце ход датэрміновага галасавання?***

— Датэрміновае галасаванне выкарыстоўваецца досыць шырока, напрыклад, у ЗША і шэрагу краін Заходняй Еўропы. Ёсць такая норма і ў беларускім выбарчым заканадаўстве. Магу сказаць, што назіральнікі ад СНД, якія прысутнічалі на выбарчых участках пры датэрміновым галасаванні, адзначалі дакладнасць і зладжанасць у рабоце членаў участковых выбарчых камісій, выкананне імі неабходных працэдур у адпаведнасці з патрабаваннямі Выбарчага кодэкса.

Назіралася таксама дастаткова высокая актыўнасць выбаршчыкаў. Многія грамадзяне, якія прагаласавалі датэрмінова, тлумачаць гэта жаданнем не займаць выбарамі нядзелю.

***— Ці адчуваеце Вы заяўленую ЦВК лібералнасць падчас бягучай электаральнай кампаніі? У прыватнасці, у фарміраванні і рабоце выбарчых камісій розных узроўняў?***

— Наколькі нам вядома, у Беларусі ўтвораны 155 тэрытарыяльных і 6 390 участковых камісій па выбарах прэзідэнта. У прамежкавай справаздачы Місіі мы адзначалі, што ўсе яны былі сфарміраваны ў адпаведнасці з заканадаўствам і ва ўстаноўленыя Выбарчым кодэксам тэрміны. Пры гэтым у склад тэрытарыяльных камісій увайшлі прадстаўнікі сямі палітычных партый і пяці грамадскіх аб'яднанняў, у склад участковых — прадстаўнікі дзесяці палітычных партый і пяці грамадскіх аб'яднанняў.

Безумоўна, станоўчым момантам з'яўляецца і тое, што на цяперашніх выбарах у склад камісій скіравана больш, чым раней, прадстаўнікоў ад апазіцыйных партый. Кандыдатам у прэзідэнты была дадзена магчымасць скіраваць па адным сваім прадстаўніку ў Цэнтральную камісію ў якасці члена з правам дарадчага голасу. Такой магчымасцю скарысталіся сямёра з іх. Мы таксама бачым, што работа самога Цэнтрвыбаркама праходзіць на аснове калегіяльнасці, адкрытага абмеркавання і вырашэння пытанняў. На пасяджэннях ЦВК, пра якія паведамляецца загадзя, заўжды прысутнічаюць міжнародныя назіральнікі ад нашай Місіі, нашы калегі з Місіі АБСЕ, прадстаўнікі партый, журналісты. Эфектыўна працуе інтэрнэт-сайт Цэнтрвыбаркама, дзе можна атрымаць усю інфармацыю, якая датычыць выбарчай кампаніі.

***— Якія фактары адыграюць вырашальную ролю пры ацэнцы выбарчай кампаніі місіяй СНД?***

— Хацелася б падкрэсліць, што дзейнасць Місіі назіральнікаў ад СНД будуецца строга ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, дакументамі, прынятымі ў рамках Садружнасці, і агульнапрынятымі міжнароднымі нормамі.

Для нас вельмі важна, каб працэс назірання засноўваўся на прынцыпах палітычнай нейтральнасці і бесстароннасці, неўмяшання ў ход выбарчага працэсу і ва ўнутраныя справы дзяржавы.

Свае высновы і ацэнкі Місія робіць на падставе аналізу вынікаў толькі ўласнага маніторынгу, фактычнага матэрыялу і звестак, сабраных у працэсе доўгатэрміновага і кароткатэрміновага назірання, а таксама афіцыйнай інфармацыі ад выбарчых камісій, органаў выканаўчай улады, перадвыбарчых штабаў кандыдатаў, назіральнікаў іншых міжнародных арганізацый.

***— Калі характарызаваць гэтую электаральную кампанію ў Беларусі літаральна адным эпітэтам, які б вы ўжылі?***

— На мой погляд, даваць ацэнку ўсёй выбарчай кампаніі цяпер, не дачакаўшыся яе завяршэння, было б няправільна. Аднак я вельмі спадзяюся, што яна завяршыцца спакойна і годна. Прынамсі, папярэдні ход выбарчай кампаніі дае нам для гэтага важкія падставы.

Ала МАЧАЛАВА.



# ЗАЦЬМЕННІ: важна не збочыць з абранага шляху

**У бліжэйшы час нас чакае шмат цікавых астранамічных падзей. Адна з іх — апошняе ў гэтым годзе зацьменне Месяца, якое адбудзецца 21 снежня ў 10 гадзін 17 хвілін.**

— Гэта будзе **поўнае месяцавае зацьменне**, — патлумачыла **беларускі астролаг Кацярына ФЛІКОП**. — Яго змогуць убачыць жыхары паўночнага ўсходу Расіі, паўночнай Еўропы, Паўночнай Амерыкі і заходняй часткі Паўднёвай Амерыкі.

Ужо на пачатку 2011 года **(4 студзеня ў 0.17)** нас чакае другое зацьменне — **частковае сонечнае**. Яго можна будзе ўбачыць у прыпалярных і сярэдніх шыротах паўночнага паўшар'я.

На працягу года нас чакаюць яшчэ **3 частковыя сонечныя зацьменні**: **2 чэрвеня ў 0.17, 1 ліпеня ў 11.39 па летнім часе, 25 лістапада ў 8.21**. Усе яны таксама будуць бачныя ў прыпалярных і сярэдніх шыротах паўночнага паўшар'я.

Не абыдзецца ў 2011-м і без месяцавых зацьменняў. Два **поўныя месяцавыя зацьменні (15 чэрвеня ў 23.13 і 10 снежня ў 16.32)** будуць бачныя на большасці тэрыторыі Еўропы.

У сумежныя з часам зацьмення дні (гэта тычыцца і сонечных зацьменняў, і месяцавых) звычайна назіраецца напружаная эмацыянальная абстаноўка, адбываецца шмат лёсавызначальных падзей, наступствы якіх вельмі складана змяніць. Гэта час, калі важна дакладна вызначыць свае самыя важныя памкненні і мэты, каб не збочыць з абранага шляху і паступіць правільна.

У сонечныя зацьменні можа аказацца складана ўзяць сябе ў рукі і правільна з'арыентаваць сваё жыццё. Варта ў гэты час засцерагацца спакус, ілюзій і слабасцяў. Гэта час унутранай барацьбы, калі выпрабоўваюцца наша маральнасць і духоўнасць.

У перыяд месяцавага зацьмення чалавеку прасцей адчуць сваю духоўную прыроду, настроіцца на высокія пачуцці, у нечым пераадолець сябе.

У бліжэйшыя тры дні да і пасля зацьмення астролаг раіць быць асабліва асцярожнымі ў дзеяннях, больш уважлівымі і далікатнымі ў кантактаванні, каб змякчыць і разрадзіць атмасферу напружанасці, абумоўленай уплывам зацьмення.

Такім чынам, новы 2011 год будзе насычаны зацьменнямі, да кожнага з якіх трэба маральна падрыхтавацца і сустрэць іх спакойна.

**Таіса ВАСІЛЬЕВА.**

**Доктар адкажа**

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**20 снежня** — намеснік дырэктара РНПЦ «Кардыялогія» Маргарыта Іванаўна БЕЛЬСКАЯ.

**21 снежня** — начальнік аддзела ліцэнзавання медыцынскай дзейнасці Міністэрства аховы здароўя Алег Яўгенавіч ЛЕЎШУКОЎ.

**22 снежня** — дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін Усцінавіч ВІЛЬЧУК.

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**20 снежня** — загадчык акушэрска-фізіялагічнага аддзялення Мінскага абласнога радзільнага дома Наталля Аляксандраўна ФЕДАСЕЕВА.

**21 снежня** — загадчык артапедатраўматалагічнага аддзялення № 2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Уладзімір Якаўлевіч КАЧАНАЎ.

**22 снежня** — адказны ўрач РКЦ Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Сяргей Мікалаевіч ГРЫДЗІН.

## Минский районный исполнительный комитет *30 декабря 2010 года* повторно проводит открытый *аукцион* на право заключения договора аренды земельного участка в Минском районе

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Боровлянский с/с, д. Слободщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623680608101000084 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1257 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 665 539 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 2 869 долларов США |
| 9 | Задаток (рублей) | 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **30.12.2010 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **24.12.2010 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

## Минский районный исполнительный комитет *30 декабря 2010 г.* повторно проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Звенячи | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 32 | Лошанский с/с, а/г Лошаны | Луговослободской с/с, д. Дворец | Луговослободской с/с, д. Заямочное | Луговослободской с/с, д. Ксаверово |
| 2 | Кадастровый номер | 623681306601000085 | 623684001601000296 | 623684005601000273 | 623684103101000078 | 623684106601000193 | 623684107601000087 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1413 га | 0,2411 га | 0,1915 га | 0,1554 га | 0,1261 га | 0,2302 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 109 890 | 480 350 | 880 032 | 1 062 465 | 830 860 | 620 311 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 10 000 000 | 24 000 000 | 31 000 000 | 18 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 000 000 | 2 400 000 | 3 100 000 | 1 800 000 | 2 200 000 | 2 200 000 |

| | | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Луговослободской с/с, д. Прилесье | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 75 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 76 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 336 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 340 |
| 2 | Кадастровый номер | 623684110101000453 | 623687508101000945 | 623687508101001079 | 623687508101000866 | 623687508101001035 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1538 га | 0,1340 га | 0,1350 га | 0,1251 га | 0,1333 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 739 797 | 84 000 | 84 000 | 84 000 | 84 000 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 34 000 000 | 14 000 000 | 14 000 000 | 13 000 000 | 14 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 400 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 300 000 | 1 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **30.12.2010 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **24.12.2010 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2–3 – на расчетный счет № 3600621060087 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лоты 4–7 – на расчетный счет № 3600621070093 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 8–11 – на расчетный счет № 3600621170195 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# МАРСКІ ФЛОТ ПАД СЦЯГАМ БЕЛАРУСІ

**МІНСКІМ гарадскім выканаўчым камітэтам зарэгістравана закрытае акцыянернае таварыства «Белмарфлот» — першая ў краіне марская суднабудаўнічая кампанія. 70 працэнтаў акцый у статутным фондзе належаць швейцарскай карпарацыі, 30 працэнтаў — іншым замежным інвестарам.**

ЗАТ «Белмарфлот» — рэзідэнт Рэспублікі Беларусь, асноўнай задачай якога з'яўляецца эксплуатацыя марскіх суднаў, узятых у арэнду і ўкамплектаваных пераважна беларускімі экіпажамі. У далейшым асновай флоту стануць марскія судны, якія будуць набывацца кампаніяй ва ўласнасць на ўмовах фінансавага лізінгу. Новыя судны будуць будавацца на суднаверфях Кітая і Харватыі. Фінансаванне пабудовы плануецца весці як за кошт уласных сродкаў акцыянераў, так і з прыцягненнем сродкаў у рамках адкрытай для Рэспублікі Беларусь кітайскай крэдытнай лініі. Швейцарская карпарацыя ўжо мае суднабудаўнічы завод у Сербіі. Гэта адно з буйнейшых такіх прадпрыемстваў у Паўднёвай Еўропе. Карпарацыя плануе інвеставаць на працягу 5-7 гадоў у будаўніцтва новых марскіх суднаў 100 мільёнаў долараў ЗША і разлічвае на прыбытак ад паспяховай вытворчай дзейнасці. Пры гэтым спадзяецца, што ЗАТ «Белмарфлот» штогод будзе атрымліваць адно-два марскія судны рознага прызначэння і тыпу для марскога забеспячэння патрэбаў эканомікі Беларусі.

Уласны марскі гандлёвы флот дасць новыя магчымасці для пашырэння транзітнага патэнцыялу краіны і забеспячэння незалежнасці знешняга гандлю, стане эфектыўным крокам да павелічэння экспарту за кошт аптымізацыі і імпартазамяшчэння паслуг марскіх перавозак. Да таго ж паспрыяе стварэнню новых працоўных месцаў, павелічэнню паступлення валютнай выручкі. Мае вялікае значэнне і іміджавы аспект — павышэнне міжнароднага аўтарытэту Рэспублікі Беларусь.

Першы рэйс па перавозцы айчынных калійных угнаенняў у Бразілію ЗАТ «Белмарфлот» зробіць да канца года цеплаходам «Катарына» грузападымальнасцю 27,5 тысячы тон. У пачатку наступнага года запланаваны другі рэйс з угнаеннямі ў Лацінскую Амерыку цеплаходам «Караліна» грузападымальнасцю 37 тысяч тон.

Акрамя таго, зараз акцыянеры і інвестары вядуць перамовы з кітайскімі партнёрамі адносна набыцця ў наступным годзе ў Кітаі сучаснага балкера грузападымальнасцю 33 тысячы тон. У трэцім-чацвёртым квартале 2011 года плануецца ўпершыню ўзняць беларускі сцяг на балкеры для перавозкі насыпных і навалачных грузаў класа супермакс, грузападымальнасцю 57 тысяч тон, што будуецца ў Кітаі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПА ЧУЖЫМ ПАШПАРЦЕ ДВА МАБІЛЬНІКІ

Беспрацоўны жыхар Віцебска ўмудрыўся па чужым пашпарце купіць у крэдыт два дарагія прэстыжныя мабільныя тэлефоны агульным коштам больш за 4,7 мільёна рублёў. Толькі потым высветлілася, што пакупнік наклеіў сваё фота ў чужы пашпарт і пайшоў на хітрасць. 42-гадовы злодзей купіў мабільнікі ў цэнтры продажу і абслугоўвання абанентаў адной з кампаній па аказанні паслуг мабільных сувязяў. У дачыненні да мужчыны заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Минской городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 19 января 2011 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Наименование и характеристики продаваемого имущества** | **Корпус очистных сооружений (четырехэтажное здание) с инвентарным номером 500/С-47411, общая площадь 2881 кв.м** |
| **Сведения о земельном участке** | Продаваемое здание расположено на земельном участке площадью 19,8473 га с кадастровым номером 500000000001002170 |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18 |
| **Балансодержатель** | УП «МЗАЛ им. П.М. Машерова», 220088, г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 40 22 |
| **Начальная цена** | 2 816 851 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 280 000 000 белорусских рублей |

На продаваемое здание обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней и примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, код 153001334; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **19 января 2011 г.** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 21.12.2010 по 17.01.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22.**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Сведения о балансодержателе: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель. ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79 67 14.**

| № лота | Наименование объекта аренды и его характеристика | Местоположение объекта аренды | Цель использования объекта аренды | Коэффициенты месторасположения и спроса к базовой ставке (по договору) | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение площадью 18,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 2 | 161 875 | 16 100 |
| 2 | Помещение площадью 24,7 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 2 | 216 125 | 21 600 |
| 3 | Помещение площадью 177,8 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 1 555 750 | 155 500 |
| 4 | Помещение площадью 11,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 100 625 | 10 000 |
| 5 | Помещение площадью 12,6 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 110 250 | 11 000 |
| 6 | Помещение площадью 15,9 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 139 125 | 13 900 |
| 7 | Помещение площадью 61,3 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи и автоматической телефонной станции; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 76 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 536 375 | 53 600 |
| 8 | Помещение, состоящее из четырех комнат (10,7 кв.м, 43,2 кв.м, 13,4 кв.м, 6,4 кв.м) общей площадью 73,7 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании УОПП; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Жлобин, ул. Урицкого, д. 41 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 644 875 | 64 400 |
| 9 | Помещение, состоящее из трех комнат (23,97 кв.м, 15,02 кв.м, 8,8 кв.м) общей площадью 47,79 кв.м, расположенное на 1-м этаже в помещении отделения почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Мозырь, ул. Нелидова, д. 3а | Осуществление торговли, оказание услуг, размещение складских помещений, офиса | 0,6 х 3 | 418 163 | 41 800 |
| 10 | Помещение площадью 201,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 34 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 1 763 125 | 176 300 |
| 11 | Помещение площадью 17,78 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 34 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 155 575 | 15 500 |
| 12 | Помещение площадью 15,2 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 34 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 133 000 | 13 300 |
| 13 | Помещение площадью 18,04 кв.м, расположенное на 3-м этаже в здании районного узла почтовой связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 34 | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 1 х 3 | 157 850 | 15 700 |
| 14 | Помещение площадью 65,2 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании гаража; здание без удобств. | г. Гомель, рп. Кастюковка, ул. 9 Мая, 1б | Размещение гаража, склада, оказание услуг, производство | 0,7 х 2 | 570 500 | 57 000 |
| 15 | Помещение площадью 35,58 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании специализированном связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Гомель, рп. Кастюковка, ул. 9 Мая, 1б | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 0,7 х 3 | 311 325 | 31 100 |
| 16 | Помещение площадью 20,82 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании специализированном связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Гомель, рп. Кастюковка, ул. 9 Мая, 1б | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 0,7 х 3 | 182 175 | 18 200 |
| 17 | Помещение площадью 14,9 кв.м, расположенное на 1-м этаже в здании специализированном связи; здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением и канализацией, телефонизировано. | г. Гомель, рп. Кастюковка, ул. 9 Мая, 1б | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 0,7 х 3 | 130 375 | 13 000 |

**Базовая ставка за 1 кв.м арендуемой площади: г. Жлобин и г. Мозырь – 0,25 БВ в рп Костюковка – 0,3 БВ;**

**Срок аренды – 5 лет.**

При заключении договоров аренды **ставка арендной платы может быть скорректирована** с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. № 518 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток до «17» января 2011 г. на р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 334, УНН 102353509, ОКПО 55484006. Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

**Дата проведения аукциона «19» января 2011 г. в 11.00 в Гомельском областном управлении филиала «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а».**

**Организатор аукциона:** ГОУ филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:

* заявление по установленной форме;

* копии платежного поручения, заверенной банком, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении;

* индивидуальные предприниматели – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; * юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; * юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

* представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

* физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Подача документов по почте не допускается.

Аукцион является открытым. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение 5 рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона будут заключены договора аренды недвижимого имущества.

**Документы для участия в аукционе принимаются по адресу:** г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний срок подачи документов** «18» января 2011 г. до 17.00.

**Заключительная регистрация** в день аукциона с 10.00 до 11.00. состоится по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Контактные телефоны: (0232) 77 37 27, 77 52 78; 77 52 87.

# СТВАРАЕМ КРАІНУ, СТВАРАЕМ СЯБЕ!






*Сёння мы працягваем расказ пра найбольш адметныя прадпрыемствы і арганізацыі, якія ўвайшлі ў фотаальбом БЕЛТА «БЕЛАРУСЬ СТВАРАЛЬНАЯ»*

## «АТЛАНТ» ФАРБУЕ ХАЛАДЗІЛЬНІКІ І РОБІЦЬ СТАЎКУ НА МАЛАДЫХ СПАЖЫЎЦОЎ





**ВЫПУСК каляровых халадзільнікаў у гэтым годзе наладзілі на ЗАТ «Атлант» — сёння спажывец мае магчымасць замяніць свой традыцыйны белы халадзільнік і выбраць новы: шэры металік, серабрысты, бэжавы, рубінавы, салатны ці залацісты. Прычым гэтыя шэсць колераў — базавыя, аднак пры жаданні на «Атланце» могуць выпускаць халадзільнікі абсалютна любога колеру:**

— Мы ўсталявалі новую афарбовачную камеру па метале, зараз запускаем афарбовачную камеру па пластмасе — гэта ўсё нам дазволіла пашырыць колеравую гаму, — расказвае **Алег БЕЛАЗОР, начальнік аддзела маркетынгу і рэкламы ЗАТ «Атлант»**. — Па ідэі, мы можам зрабіць халадзільнік любога колеру: запраўляем у афарбовачную камеру любую фарбу і калі ласка — ўсе колеры вясёлкі. Але мы за аснову выбралі шэсць колераў, якія аказаліся найбольш папулярнымі па выніках праведзенага маркетынгавага даследавання. Аднак час не стаіць на месцы — як з'явяцца новыя тэндэнцыі, будзем падстройвацца і выпускаць халадзільнікі іншых колераў.

Спецыялісты на «Атланце» перакананыя, што ўсё роўна традыцыйна белыя халадзільнікі сваіх моцных пазіцый на рынку не здадуць:

— Свет змяняецца, зараз людзі купляюць халадзільнік пад дызайн кухні. Аднак усё роўна лідарскія пазіцыі будуць займаць белыя халадзільнікі — гэта 85%, — лічыць **Кірыл ЛІМАРЭНКА, начальнік бюро рэкламы «Атланта»**. — На другім месцы ідзе серабрысты халадзільнік, ну а потым — астатнія колеры, якія разам набяруць 1-2% ад продажу. Але паколькі спажывец хоча браць каляровыя халадзільнікі, то мы ім такую магчымасць прадастаўляем: мала таго, што выпускаем каля шасці дзясяткаў мадэляў халадзільнікаў, дык іх яшчэ можна і купіць і ў розным каляровым выкананні, — сказаў Кірыл Лімарэнка.

Пры гэтым ён адкрыў маленькі сакрэт: у 2011 годзе каляровымі «Атлант» будзе мець магчымасць выпускаць не толькі халадзільнікі, але і пральныя машыны — чорныя, серабрыстыя, чорна-серабрыстыя. Здзівіць спажыўцоў «Атлант» спрабуе не толькі новымі колерамі, але і новымі мадэлямі пральных машын і халадзільнікаў.

Сёлета «Атлант» пачаў выпускаць дзве новыя мадэлі халадзільнікаў: «вузкі» варыянт для малагабарытных кухань шырынёй 54,5 см, а другі — з абсалютна новым унутраным і знешнім дызайнам, з электронным блокам кіравання. Што датычыцца пральных машын, то іх зараз у лінейцы выпускаецца 20 адзінак — розныя па кіраванні, аб'ёму загрузкі, колькасці абаротаў. У наступным годзе з'явяцца яшчэ 3 мадэлі пральных машын — з рознымі спосабамі кіравання (больш простым для пажылых людзей і з ВК-экранамі для прасунутай моладзі), а таксама з павялічанай загрузкай — па 6 і 7 кілаграмаў бялізны.







Ёсць свае поспехі ў «Атланта» і па выпуску электрычных і газавых пліт, якія выпускаюцца ў Гомелі: калі ў пачатку года яны прадаваліся толькі ў Беларусі, то сёння «атлантаўскія» пліты пастаўляюцца ў Расію, ва Украіну і Азербайджан.

Што датычыцца вытворчасці халадзільнікаў, то сёлета «Атлант» выпускае больш за 1 мільён халадзільнікаў і каля 300 тысяч пральных машын, а прадукцыя завода пастаўляецца больш чым у 20 краін свету.

— Па пральных машынах мы займаем 35-40% рынку ў Беларусі, і гэтая доля пастаянна расце (па халадзільніках, дарэчы, «Атлант» трымае 82% рынку краіны). Нашая пральная машына стала папулярнай як у беларускага спажыўца, так і ў расійскага, украінскага. Добрыя пастаўкі пральных машын маем на Захад, у прыватнасці — у Германію. Цікава, што пры такіх моцных сваіх брэндах, як Bosch і Siemens, немцы купляюць нашу тэхніку. Гэта сведчыць пра тое, што яны ацанілі якасць нашых пральных машын.

Якасць беларускай тэхнікі адзначаюць і расійскія спажыўцы. Прычым, як расказаў Алег Белазор, расіяне даведваюцца пра якасць у сэрвісных цэнтрах:

— Мы былі на выставе ў Расіі, да нас падыходзіла шмат людзей. Яны ўзгадвалі, што «Атлант» — гэта былы «Мінск», і казалі: значыць, якасны! Наогул, яны сур'ёзна падыходзяць да якасці. Ведаеце, як выбіраюць тэхніку? Тэлефануюць у сэрвісныя цэнтры і пытаюць, якую тэхніку менш за ўсё здаюць у рамонт. А там ім кажуць, што «Атлант» па якасці самы лепшы. Не падумайце, што я нешта прыдумляю ці хачу дрэннае нешта сказаць пра карэйскую ці еўрапейскую тэхніку, але нам так казалі рэальныя людзі на выставе, дзе мы былі на працягу 5 дзён, — расказвае Алег Міхайлавіч. — Тое самае і ў Беларусі: мы шчыльна супрацоўнічаем з «Рамбыттэхнікай», дык яны кажуць, што мы іх хутка без працы пакінем, — смяецца Алег Белазор.

— Скажу так: усе замежныя брэнды пазначаюць тэрмін эксплуатацыі 5-7 гадоў, — дадае Кірыл Лімарэнка. — Гэта значыць, што праз 5-7 гадоў спажывец у прынцыпе павінен абрэзаць шнур і выкінуць халадзільнік з хаты, бо вытворца больш не адказвае ні за бяспеку, ні за якасць. Гэта робіцца для таго, каб абнаўленне парка адбывалася больш хутка, каб тэхнікі больш прадавалася. «Атлант» жа ставіць тэрмін эксплуатацыі 10 гадоў — гэта таксама пра нешта кажа, праўда?

Вялікую ўвагу на «Атланце» надаюць энергаэфектыўнасці. Сёння халадзільнікі тут выпускаюцца з класам энергаэфектыўнасці «А» і «А+». Прычым матор-кампрэсары на «Атланце» таксама свае — іх выпускаюць па японскай і аўстрыйскай тэхналогіях на Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе. Як адзначыў Кірыл Лімарэнка, прадпрыемства надае вялікую ўвагу выпуску энергаэфектыўнай прадукцыі, бо пры росце цэнаў на энергетычныя рэсурсы і адпаведна на камунальныя паслугі спажыўцы зараз вельмі зацікаўленыя, каб іх бытавая тэхніка спажывала як мага менш электрычнасці, вады і гэтак далей.

— Мы пазіцыянуем сваю прадукцыю ў сярэднім цэнавым сегменце і вышэй. У нас ёсць бытавая тэхніка для сем'яў з розным бюджэтам: напрыклад, тыя ж халадзільнікі мы выпускам як па цане 700 тысяч рублёў, так і больш за 1,5 мільёна — гэта ўжо прэміум-мадэлі. Такім чынам, у нас вельмі шырокая лінейка прадукцыі, — сказаў Алег Белазор.

Кірыл Лімарэнка дадаў, што «Атлант» зараз спрабуе заваяваць папулярнасць яшчэ і сярод маладых людзей:

— Мы стараемся амаладзіць нашу аўдыторыю — даём рэкламу ў інтэрнэце, выкарыстоўваем іншыя камунікатыўныя рэсурсы, якімі карыстаецца моладзь. Скажам шчыра, што ва ўсіх брэндаў спажыўцы старэюць, а моладзь не ведае, які брэнд самы прагрэсіўны і самы якасны. Таму мы зараз стараемся прыцягнуць увагу да брэнда «Атлант» і робім асноўны ўпор менавіта на моладзь, — сказаў Кірыл Лімарэнка і дадаў, што пазіцыі іх брэнда ў Беларусі вельмі моцныя. — У нас практычна 100% пазнавальнасць брэнда, калі казаць пра халадзільнікі, і працэнтаў 70 — па пральных машынах.

Дарэчы, сёння на ўсіх трох «Атлантаўскіх» заводах працуе каля 11 тысяч чалавек, з якіх на заводзе халадзільнікаў — 6,7 тысячы. Як расказаў «Звяздзе» **Аляксандр МАШКО, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай працы і персанале**, сёння сярэдняя зарплата на «Атланце» складае 1,8 мільёна рублёў. «Зарплата, я лічу, дастойная, умовы працы вельмі добрыя, — кажа А. Машко. — Ёсць свае санаторыі, свой інтэрнат, свой фізкультурна-аздараўляльны комплекс. Таму сёння мы не адчуваем недахопу ў спецыялістах, а уладкавацца на завод лічыцца прэстыжным». Таксама Аляксандр Вікенцьевіч расказаў, што на прадпрыемстве не забываюць і пра 2,5 тысячы ветэранаў, якія прапрацавалі шмат гадоў на заводзе і пайшлі на пенсію — штомесяц кожнаму з іх выплачваецца 40 тысяч.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**
**Фота аўтара і БЕЛТА.**






## ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

**ААТ «Беларускі аўтамабільны завод» спецыялізуецца на выпуску кар'ерных самазвалаў вялікай і асабліва вялікай грузапад'ёмнасці, а таксама іншага цяжкага транспартнага абсталявання, якое выкарыстоўваецца ў горназдабыўнай і будаўнічай галінах прамысловасці.**

**У 2008 годзе ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускі аўтамабільны завод адзначыў 60-гадовы юбілей.**

**7 лістапада 1958 года з канвеера завода сышоў першы 25-тонны МАЗ-525 (вытворчасць гэтых машын была перададзена з Мінскага аўтамабільнага завода).**

**У 1960 годзе на прадпрыемстве прыступілі да праектавання «Белазаў» — самазвалаў прынцыпова новай канструкцыі для распрацоўкі радовішчаў карысных выкапняў адкрытым метадам.**

**Усяго ж за ўсю гісторыю прадпрыемства Беларускім аўтазаводам распрацавана больш за 500 мадыфікацый кар'ерных самазвалаў грузапад'ёмнасцю ад 27 да 320 тон, выпушчана звыш 130 тысяч адзінак кар'ерных самазвалаў, якія былі адпраўлены ў больш як 70 краін свету.**




# Важкія перспектывы БЕЛАРУСКАГА АЎТАМАБІЛЬНАГА ЗАВОДА



— За 2010 год калектыў Беларускага аўтамабільнага завода дасягнуў добрых вытворча-гаспадарчых і эканамічных паказчыкаў, — расказаў **Генеральны дырэктар аб'яднання Пётр ПАРХОМЧЫК**. — Мы ўмацавалі свае пазіцыі літаральна на ўсіх рынках, пашырылі геаграфію экспарту. І самым вялікім дасягненнем гэтага года з'яўляецца тое, што мы здолелі за кароткі перыяд пасля сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу рэзка нарасціць вытворчасць кар'ерных самазвалаў вялікай грузапад'ёмнасці. Толькі за 9 месяцаў завадчанамі выраблена 238 самазвалаў грузапад'ёмнасцю ад 136 да 360 тон. Такой колькасці кар'ернай тэхнікі сёння не робіць ніводны з яе сусветных вытворцаў. І ёсць поўная ўпэўненасць у тым, што да канца года будзе выраблена 368-370 кар'ерных самазвалаў такой грузапад'ёмнасці. Гэта будзе рэкорд прадпрыемства, таму што такой колькасці кар'ернай тэхнікі асабліва вялікай грузапад'ёмнасці белазаўцы не выраблялі больш за два дзясяткі апошніх гадоў. Мы практычна вярнуліся на паказчыкі, дасягнутыя пры жыцці ў вялікай і дружнай сям'і, якая звалася Савецкім Саюзам.

Яшчэ адна важная падзея ў жыцці нашага калектыву адбылася зусім нядаўна — у Кітайскай Народнай Рэспубліцы з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адкрылася сумеснае прадпрыемства з сэрвісным цэнтрам, вытворчыя плошчы якога перавышаюць 4 тысячы квадратных метраў. Прычым зроблена яно было за максімальна кароткі тэрмін. Там ствараецца лагістычны цэнтр, з дапамогай якога мы зможам уваходзіць і ў суседнія з Кітаем краіны рэгіёна.

А яшчэ раней мы адкрылі сумеснае прадпрыемства ў Казахстане, якое ўжо прыступіла да працы. Яго галоўная задача — стварыць новую тэхніку і стаць лідарам у вытворчасці самазвалаў, якія працуюць пад зямлёй. Гэта доўгі шлях, але мы ўзяліся за гэтую працу і ставім перад сабой задачу быць першымі не толькі ў вытворчасці кар'ерных самазвалаў, якія выкарыстоўваюцца пры адкрытым метадзе здабычы карысных выкапняў, але і для закрытага метаду іх здабычы.

Не так даўно зарэгістравана ў Расійскай Федэрацыі прадпрыемства сумесна з Коркінскім экскаватарна-рамонтным заводам Чалябінскай вобласці. Для зборкі кар'ерных самазвалаў малой грузапад'ёмнасці — 30-45-55 тон. У наступным годзе мы плануем там збіраць ад 100 да 200 адзінак такой тэхнікі.

Узраслі і экспартныя пастаўкі нашай прадукцыі. За першае паўгоддзе было рэалізавана столькі ж прадукцыі, колькі мы прадалі за ўвесь мінулы год, які быў для завода вельмі складаным па прычынах, якія не залежалі ад нас. Але мы змаглі выбудаваць сваю працу так, каб калі трэба — зрабіць рывок. І мы яго зрабілі. Па выніках года экспарт павінен скласці 630-635 мільёнаў долараў. Гэта для нас вялікі крок наперад.

Таксама мы правялі сур'ёзную працу на нашым Магілёўскім аўтамабільным заводзе і завяршаем праект па стварэнні там вытворчых магутнасцяў па выпуску чыгуначных вагонаў. І ўжо сёлета вырабім больш за тысячу вагонаў. І самае галоўнае — пашырана гама прадукцыі. Калі раней там рабілі толькі грузавы вагон і хопер для перавозкі калійных угнаенняў, то сёння мы гатовыя прапанаваць пакупнікам цэментавозы і збожжавозы, вагоны для перавозкі лесу, кантэйнераў... Так што ў гэтага прадпрыемства вельмі добрая перспектыва.

На наступную пяцігодку перад калектывам стаіць задача павялічыць аб'ём вытворчасці прынамсі ў 1,7 раза. Адпаведна вырасце і заработная плата працаўнікоў. Сёння яна складае ў эквіваленце 550 долараў, а да канца пяцігодкі павінна перавысіць 1 тысячу долараў.

Нам трэба нарасціць вытворчасць кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузапад'ёмнасці. За найбліжэйшыя два гады мы маем намер стварыць яшчэ адну зборачную вытворчасць плошчай 14,5-15 тысяч квадратных метраў, дзе плануем збіраць кар'ерныя самазвалы асабліва вялікай грузапад'ёмнасці — 320-360 тон. А ў сярэдзіне новай пяцігодкі, я думаю, мы парадуем нашу краіну яшчэ адным поспехам і пакажам кар'ерны самазвал грузапад'ёмнасцю 420 тон.

Цяпер нашы аўтасамазвалы працуюць практычна ва ўсіх кутках зямнога шара. Гэта Аўстралія і В'етнам, Кітай і Манголія, афрыканскія краіны — Ангола, Егіпет і ПАР, краіны Лацінскай Амерыкі — Венесуэла, Куба, Чылі. Зроблены вельмі добрыя напрацоўкі і ўжо ў наступным годзе нашы машыны будуць пастаўляцца ў Бразілію, Індыю, Інданэзію. А наогул перад завадчанамі стаіць задача не аддаць ніводнай пядзі «сваёй зямлі» на традыцыйных рынках збыту, дзе мы трымаем іх ёмістасці ў межах 95-96, а ў некаторых дзяржавах постсавецкай прасторы і да 100 адсоткаў. Паступова адваёўваем рынкі і ў нашых канкурэнтаў. Пацвярджэннем таму можа служыць заключэнне кантракта з Карэяй на пастаўку ў гэтую краіну 55-тонных самазвалаў на суму больш за 15 мільёнаў долараў.

**Сёння прадукцыя ААТ «Беларускі аўтамабільны завод», яго філіяла — Магілёўскага аўтамабільнага завода, а таксама СЗАТ «Магілёўскі вагонабудаўнічы завод» і РУП «Старадарожскі механічны завод», якія ўваходзяць у склад ПА «БелАЗ», гэта:**

**— кар'ерныя самазвалы грузапад'ёмнасцю ад 30 да 320 тон;**

**— самазвалы павышанай праходнасці з гідрамеханічнай трансмісіяй;**

**— будаўніча-дарожныя машыны і машыны для абслугоўвання горна-транспартных работ: пагрузчыкі, бульдозеры, аўтабетонамяшалкі, скрэперы, цягачы-буксіроўшчыкі;**

**— машыны для падземных работ: самазвалы падземныя, пагрузачна-даставачныя машыны, шасі ўніверсальныя, транспартныя сродкі для перавозкі людзей, падземныя бетонамяшалкі;**

**— машыны для металургічных прадпрыемстваў: шлакавозы, цяжкавозы;**

**— машыны адмысловага прызначэння: каткі самаходныя, шасі пад вібраўстаноўку, смеццявозы, аэрадромныя цягачы, паліваарашальныя машыны;**

**— грузавы рухомы састаў: вагоны-хоперы для перавозкі мінеральных угнаенняў, люкавыя паўвагоны,**

**— тавары народнага спажывання.**









**Сяргей ПРОТАС.**
**Фота БЕЛТА**
**і з архіва прадпрыемства.**

# МАЗ збіраецца выпускаць мікрааўтобусы і капотныя грузавікі

**Генеральны дырэктар МАЗа Аляксандр БАРОЎСКІ на прэс-канферэнцыі падзяліўся з журналістамі вынікамі працы завода ў 2010 годзе і расказаў пра навінкі свайго прадпрыемства. У прыватнасці, на МАЗе сёлета зроблена 16 новых мадэляў, а ўжо ў 2011 годзе будзе прэзентаваны капотны грузавік, а таксама асвоена вытворчасць мікрааўтобусаў.**



— У жніўні мы выпусцім новы 60-тонны капотны грузавік. КамАЗ таксама прыступіў да распрацоўкі аналагічнай машыны, а мы іх хочам апярэдзіць, хочам быць заканадаўцамі моды, бо МАЗ заўсёды так рабіў, — дзеліцца планамі на будучыню Аляксандр Бароўскі. — Чаму «капотнік»? Па-першае, сёння вяртаецца мода на іх, а па-другое, гэта бяспека для кіроўцы: усё-такі перад ім ёсць два метры машыны.

Што тычыцца мікрааўтобусаў, то выпускаць іх будуць на заводзе Магілёўтрансмаш, філіяле ААТ «МАЗ», але на сёння яны існуюць толькі ў выглядзе доследных узораў:

— Мы атрымалі гэтыя два ўзоры бясплатна, над імі папрацуюць нашы канструктары, мы правядзём сваю аптымізацыю і пачнём выпускаць, — сказаў Аляксандр Бароўскі і дадаў, што прыкладны кошт такіх мікрааўтобусаў будзе 15 тысяч долараў і што яны пойдуць на «ўра». — Я паехаў да «Фальксваген», кажу: давайце разам ствараць мікрааўтобус — кошт яго атрымліваецца 25 тысяч долараў. Калі з «Мерседэсам» — 35 тысяч. Хто ў мяне купіць? Нам патрэбны свой, беларускі, аўтобус, і я знайшоў яго, ён будзе не горшы за іншыя. Паставім дыскі і шыны больш шырокія, зробім добрую аптымізацыю — мы ўсё сваё ўкладзём туды, нашы канструктары зробяць любы салон, — працягвае генеральны дырэктар. — Якасць будзе не горшая за «Фальксваген», а цана — выгадная для пакупнікоў. Скажу так — амаль еўрапейская якасць, але па беларускай цане. А ўлічваючы, што ў нас ёсць прадпрыемства «МАЗ-Купава», мы можам на базе гэтага мікрааўтобуса стварыць і халадзільнікі, і машыны хуткай дапамогі, і дзяжурныя машыны, — пры гэтым генеральны дырэктар дадаў, што акрамя прэзентаваных двух мадэляў мікрааўтобусаў на гэтай жа базе будзе выпускацца мікрагрузавік да 3 тон.









Дарэчы, Аляксандр Бароўскі лічыць, што ў кожнай аўтамашыны павінна быць імя — таму зараз праводзіцца конкурс, і неўзабаве ўсе МАЗаўскія мадэлі стануць называцца не толькі сплучэннем лічбаў, але і ўласным імем.

Як расказаў генеральны дырэктар МАЗа, яны ўжо маюць бізнес-план на 2011—2015 гады, дзе запланавана павялічыць аб'ём вытворчасці тэхнікі ў два разы:

— Мы павінны за 5 гадоў павялічыць аб'ём вытворчасці ў два разы, мы запланавалі пакуль 201%. Пры гэтым рынак Расіі ў гэтым бізнес-плане мы пакідаем на тым узроўні, які дасягнулі у 2007—2008 годзе, а ў асноўным робім упор на экспарт у іншыя краіны, які павінен павялічыцца ў 6-7 разоў. Я не баюся гэтай лічбы, у нас усе прапрацоўкі ёсць, — сказаў Аляксандр Бароўскі, адзначыўшы пры гэтым, што за бліжэйшыя 5 гадоў на заводзе запланаваны выпуск 15 новых мадэляў грузавікоў і 14 мадэляў аўтобусаў.

Больш падрабязна пра вынікі працы МАЗа ў 2010 годзе расказалі намеснікі дырэктара. **Аляксей ТУТУБАЛІН, намеснік па камерцыйных пытаннях,** пераканаены, што ўсе намечаныя на 2010 год задачы будуць выкананыя:

— Вынікі наступныя: мы чакаем, што ў 2010 годзе продажы аўтамабільнай тэхнікі складуць 22 тысячы адзінак. Гэта пры тым, што аб'ём вытворчасці ніжэйшы за продажы — мы прадалі на 2,5-3 тысячы адзінак болей, чым вырабілі. Калі параўноўваць з 2009 годам, то чаканы рост рэалізацыі складзе 146%, прычым рост дасягнуты па ўсіх прадуктах, акрамя прычэпаў і аўтакранаў, якія засталіся на ранейшым узроўні: так, па аўтобусах рост продажаў склаў 180%, па спецтэхніцы — 250%, па машынакамплектах для зборачных прадпрыемстваў — 350%, па аўтамабілях (асноўным прадукце завода) — 150%, — паведаміў Аляксей Тутубалін.

**Алег ЮШКО, намеснік генеральнага дырэктара па фінансах і эканоміцы,** лічыць, што ў пачатку года МАЗу было вельмі складана, але зараз сітуацыя выпраўляецца:

— Вельмі цяжкія ўмовы былі ў пачатку года — была вельмі вялікая пазыковая нагрузка, каля 1 трлн руб. дэбіторская запазычанасць, каля 4,5 тысячы адзінак тэхнікі на складзе. Вельмі складана пачыналася год, але ўжо сёння мы можам казаць пра пэўныя вынікі працы ў 2010 годзе: балансавы прыбытак за 11 месяцаў у параўнанні з мінулым годам вырас у 2 разы, чысты прыбытак — у 3 разы, рэнтабельнасць склала болей за 10%. Аб'ём таварнай прадукцыі — 2,3 трлн рублёў, выручка ад рэалізацыі перавысіла 2,6 трлн, сальда з'яўляецца станоўчым і складзе 60 млн долараў, экспарт за 11 месяцаў наблізіўся да памеру ў 500 млн долараў, — паведаміў Алег Юшко. — Гэта прынесла пэўныя даходы і ў скарбонку нашай дзяржавы — па гэтым годзе падатковыя плацяжы выраслі на 80 млрд рублёў. А наогул сёлета за 11 месяцаў у нас было выраблена 17625 адзінак аўтатэхнікі разам з машынакамплектамі пры паказчыку ў 16,5 тысячы летась. Складскія запасы сёння паменшыліся больш чым у два разы і складаюць каля 2 тысяч адзінак. Безумоўна, сёння фінансавы стан далёкі ад ідэальнага, але рэалізацыя, якая склалася сёлета, я мяркую, захаваецца і палепшыцца, што дазволіць нашаму прадпрыемству не толькі выжыць, але і перайсці на новы якасны ўзровень у два этапы — да 2015 года і да 2020 года.

Дарэчы, да 2015 года ў развіццё вытворчасці кіраўніцтва МАЗа плануе ўкласці 600 мільёнаў долараў, прычым каля 100 мільярдаў рублёў складуць уласныя сродкі, а астатнія — гэта інвестыцыі, у тым ліку і ад продажу часткі акцый завода:

— Мы маем акцыі 100% дзяржаўныя, і, магчыма, частка акцый будзе прадавацца. І я вельмі ўдзячны: мне ва ўрадзе паабяцалі, што грошы, якія прыйдуць ад продажу 8-10%, пойдуць на мадэрнізацыю вытворчасці. Бо ўсётакі 600 мільёнаў долараў — вялізная сума. Але калі мы не зробім рэканструкцыю, то проста не зможам канкураваць на рынку, — сказаў Аляксандр Бароўскі і дадаў, што цікавасць да МАЗа не зменшылася і існуе маса прапаноў — ад КамАЗа, групы «ГАЗ», вядуцца перамовы з Iveco. — Таксама ідуць перамовы аб набыцці часткі акцый Венесуэлай. Акрамя яе, праяўляе цікавасць яшчэ адзін буйны вытворца, не буду гаварыць пакуль, які. Але мы зараз займаемся незалежнай ацэнкай нашага прадпрыемства, — паведаміў генеральны дырэктар.

На МАЗе плануюць запусціць другую лінію канвеера, што павінна паўплываць як на аб'ём прадукцыі, так і на яе якасць:

— Сёння ў нас адна нітка канвеера, хоць, напрыклад, КамАЗ мае 2,5, «Мерседэс» — 3 лініі. Чаму так было спраектавана — не ведаю. Вядома, раней было 2-3 мадэлі, а сёння — 70. І на адной лініі збіраецца тэхніка рознага ўзроўню, рознай камплектацыі. Мы прынялі рашэнне ў 2011 годзе пабудаваць другую нітку, дзе будзем збіраць у асноўным цяжкія ваенныя машыны. Гэта павінна павысіць і аб'ёмы выпуску прадукцыі, і яе якасць, — расказвае генеральны дырэктар.

Дарэчы, якраз на якасць у наступным годзе будзе накіраваная вялікая ўвага на МАЗе.

— Мы бачым дакладную праграму тэхпераўзбраення прадпрыемства. Бо самае галоўнае — якасць нашай прадукцыі. З лютага ў нас пойдуць усе машыны з новай кабінай, гэта новае сямейства аўтамабіляў. Мы пераносім вытворчасць платформаў у Магілёў, распрацавалі тэхналогію вырабу рысораў... Ведаеце, заўсёды было сорамна за гэтую іржу, але сёння мы пераходзім на іншыя тэхналогіі, такім чынам мы хочам у 2011 годзе выйсці на вытворчасць сапраўды якаснага аўтамабіля, — сказаў Аляксандр Бароўскі. — Людзі не купляюць сёння «Жыгулі», бо там дрэнная якасць — машына адразу іржавее і гэтак далей. Людзі купляюць 5-10-гадовы «Опель», «Фальксваген», бо там якасць лепшая. Так і з МАЗам — калі былі іржавыя кабіна і кузаў, то людзі, зразумела, хацелі лепей «Мерседэс», які быў у карыстанні, купіць. Таму нам трэба перайсці гэтую грань, і мы яе пяройдзем — пытанне якасці пастаўлена вельмі жорстка.

Прычым, па словах генеральнага дырэктара, на якасць МАЗаўскіх аўтамабіляў вельмі істотны ўплыў аказвае і якасць камплектуючых:

— Калі паламаўся МАЗ, то кажуць, што МАЗ дрэнны. Але мы самі вырабляем толькі 51% дэталяў, а астатнія 49% закупляем. І сёння мы ўзяліся за камплектуючыя — збіраем пастаўшчыкоў і ставім вельмі жорсткія ўмовы. Калі раней мы заключалі кантракты на год, то зараз — на квартал, прычым мы маем правы пры пастаўцы бракаваных дэталяў гэты кантракт разарваць і спагнаць штрафы — як любяць пісаць хлопцы ў пагонах, «упушчаную выгаду», — сказаў Аляксандр Бароўскі і дадаў: — Нам выгадна часткy камплектуючых купляць у Кітаі. З імі лягчэй і па якасці дамовіцца, і цана ў іх на 40% меншая. Вось рускаму кажаш: ты дрэнна выпускаеш — ён слухае, але нічога не мяняецца. Але калі ты кітайцу зрабіў заўвагу наконт якасці, яны адразу ўсё выпраўляюць.

Дарэчы, што тычыцца такой важнай часткі машыны як рухавік, то ў МАЗа вельмі вялікія планы наконт супрацоўніцтва з Мінскім маторным заводам:

— Дзякуючы ўраду і кіраўніку дзяржавы мы правялі вельмі вялікую нараду, і цяпер ёсць праграма вырабу ў патрэбным аб'ёме рухавікоў узроўню ЕЎРА-4 і ЕЎРА-5 на Мінскім маторным заводзе. Мы хочам свой мінскі рухавік атрымаць, навошта бегаць па ўсім свеце? Вядома, патрэбны ўліванні ў ММЗ, але ж гэта праграма імпартазамяшчэння. У нас ужо ёсць першы рухавік ЕЎРА-4, мы зараз будзем яго выпрабоўваць, але я хачу мець усю лінейку рухавікоў: і лёгкіх, і сярэдніх, і цяжкіх, — сказаў генеральны дырэктар МАЗа.

А вось традыцыйны пастаўшчык рухавікоў для МАЗа, Яраслаўскі маторны завод, у Аляксандра Бароўскага выклікае пэўную асцярогу:

— ЯМЗ — наш вельмі даўні партнёр, ён нас ніколі не падводзіў, ён трымае добрую цану і, у прынцыпе, праблем па рухавіках ЕЎРА-3 у нас сёння няма. Аднак з рухавікамі ЕЎРА-4, я лічу, у яраслаўскага завода з'явіліся праблемы. Яны ўзялі французскую тэхналогію і зрабілі проста зборку, без сваёй ліцэйкі. Так, гэты рухавік вельмі добры, аднак цана на яго — заваблачная, мы не зможам яго купляць, ён нам эканамічна нявыгадны, — сказаў генеральны дырэктар МАЗа. — ЯМЗ — наш стратэгічны партнёр, але мы бачым, што там адбываецца нешта незразумелае. Я спадзяюся, што мы будзем з імі працаваць, але я павінен падстрахавацца, за мной 35 тысяч працаўнікоў стаяць, я павінен мець не аднаго пастаўшчыка.

Па словах Аляксандра Бароўскага, МАЗ не забывае і пра сацыяльную сферу: як паведаміў генеральны дырэктар, сярэдняя зарплата на заводзе складае 1,8 мільёна рублёў, усе работнікі да Новага года атрымаюць прэмію, а у пачатку 2011 года — так званую 13-ю зарплату. Пры гэтым на МАЗе аб'яўлены калядныя вакацыі з 31 снежня па 9 студзеня, працаваць будуць толькі некаторыя службы. А ў 2012 годзе, магчыма, у адпачынак усе працаўнікі пойдуць таксама разам — напрыклад, у жніўні. Як сказаў Аляксандр Бароўскі, так прынята ва ўсёй Еўропе, і такое спыненне завода для адначасовага адпачынку эканамічна выгаднае — дазваляе аптымізаваць колькасць працаўнікоў. Дарэчы, пэўная аптымізацыя колькасці персаналу ўжо праведзеная:

— Мы зрабілі праграму аптымізацыі колькасці ІТР і служачых — 4099 чалавек пераведзена на рабочыя спецыяльнасці. Праўда, частка не пагадзілася і звольнілася, але мы набралі 1 тысячу новых людзей, — тлумачыць генеральны дырэктар.

Вялікую ўвагу генеральны дырэктар надае прыцягненню на завод моладзі: у прыватнасці, прадстаўнікі МАЗа ездзяць па воінскіх часцях і прапануюць маладым людзям пасля службы ў войску прыехаць працаваць на завод. А 220 чалавек павінны прыйсці на МАЗ з беларускіх ВНУ — прычым, па словах дырэктара, адразу на добрыя пасады, з добрай зарплатай і добрымі перспектывамі.

Як расказаў Аляксандр Бароўскі, хутка пачнецца рэканструкцыя ДК «МАЗ», ідзе рамонт летняга лагера, прыведзена ў парадак падсобная гаспадарка, дзе, дарэчы, з 1 студзеня адкрыецца мясны цэх — такім чынам у МАЗаўскія сталоўкі будзе пастаўляцца прадукцыя з уласнай падсобнай гаспадаркі, а працоўныя змогуць у лік зарплаты браць мясныя вырабы.

— Я вельмі ўдзячны Богу, што мне даводзіцца працаваць з такім калектывам, тут сабраная сапраўды каманда прафесіяналаў. Мяне радуе, што ў МАЗа ёсць вялікая будучыня, ёсць загрузка вытворчасці. Сёння ёсць надзея, што МАЗ верне тыя пазіцыі, якія ён займаў на сусветным рынку, — сказаў генеральны дырэктар Аляксандр Бароўскі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**
**Фота аўтара і БЕЛТА.**



# ТАЯМНІЧЫ СВЕТ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ





**БЕЛАВЕЖСКАЯ пушча — гэта перш за ўсё ўнікальны прыродны аб'ект. Магутны лес, які займае тэрыторыю каля 125 тысяч гектараў, застаўся адзіным у Еўропе. Ён стаў прытулкам, часам апошнім, для многіх відаў жывёл і раслін, у тым ліку і свайго цара — зубра. Сёння гэты незвычайны лясны масіў ведаюць ва ўсім цывілізаваным свеце.**





ПРЫРОДНЫ комплекс атрымаў самае высокае прызнанне: 14 снежня 1992 года ўчастак высокаўзроставага лесу Нацыянальнага парку быў уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва. На постсавецкай прасторы на той час гэта быў першы аб'ект, удастоены такога ганаровага звання. У 1993-м Белавежская пушча атрымала міжнародны статус біясфернага запаведніка. А напрыканцы 1997 года савет Еўропы ўзнагародзіў Нацыянальны парк Еўрапейскім дыпломам як адну з эталонных прыродаахоўных устаноў на кантыненце. Усяго два нацыянальныя паркі на планеце маюць узгаданыя вышэй тытулы. Яны сведчаць, найперш, пра вялікую работу па захаванні прыроднага унікума.

Летась пушча адзначыла 600-гадовы юбілей. І менавіта да юбілейнай даты з'явілася шмат новага ў інфраструктуры Нацыянальнага парку, павялічылася колькасць праектаў у галіне навуковай і даследчай работы. Самае галоўнае — пабудаваны новы музей. Дарэчы гэта суперсучасны эколага-асветніцкі цэнтр з музеем прыроды. Яго дырэктар Людміла Грачанік расказвала, што падчас распрацоўкі канцэпцыі новага цэнтра ставілася задача не расказаць наведвальніку пра флору і фаўну векавога лесу, а даць магчымасць адчуць яго атмасферу. Прычым, з самай даўніны. У залах музея турысты ўбачаць не толькі лясных насельнікаў, але і манекены людзей першабытнага грамадства, сярэднявечча, апошніх вякоў мінулага тысячагоддзя, а лес адчуюць праз шматгалосую сімфонію галасоў звяроў і птушак. Гукавое афармленне максімальна набліжана да прыродных умоў.

НАВУКОЎЦЫ запаведніка рупяцца сёння аб захаванні каштоўнага генетычнага патэнцыялу пушчы. Ужо разбіта пляцоўка пад пітомнік, на якім будуць вырошчвацца саджанцы ад пушчанскіх дрэў. Цікава, што дрэвы, якія пачыналі расці 600-500 гадоў таму, калі не было ніякай матарызаванай тэхнікі і іншых сучасных забруджвальнікаў паветра, маюць іншы генетычны код, чым сучасныя дрэвы. Вось ад гэтых старэйшых пушчанскіх жыхароў будуць браць насенне і вырошчваць малады матэрыял у самым найноўшым па тэхналагічных мерках гадавальніку. Каб не вырадзіліся старадаўнія дрэвы, а вярнуліся на зямлю ў выглядзе маладых здаровых нашчадкаў.

ШТОДЗЕНЬ у пушчу едуць людзі з самых розных краін свету. Яшчэ дзясятак гадоў таму лічбы выглядалі намнога больш сціпла, чым цяпер. Сорак-пяцьдзясят тысяч турыстаў — гэта лічылася вельмі добрым паказчыкам. Паток наведвальнікаў прыкметна ўзрос, калі ў старажытным лесе пасялілася казка. Напрыканцы 2003 года ў жывапіснай мясціне адкрыўся маёнтак беларускага Дзеда Мароза. Цяпер кожнае дзіця ў Беларусі ведае, што наш казачны Дзед жыве ў пушчы са сваёй унучкай Снягуркай.

У краіне навагодняга царства, узведзенага чалавечымі рукамі, цікава пабываць і дарослым, і дзецям. Тут кожны будынак — славутасць: і скарбніца, дзе захоўваюцца пісьмы і малюнкі дзяцей, і чароўны млын, і сам дамок Дзеда Мароза. А асабліва ўражвае 160-гадовая 40-метровая елка, пад якой госці з задавальненнем водзяць карагоды. Кажуць, што яна большая за знакамітую елку на Трафальгарскай плошчы ў Лондане.

Кожны год у рэзідэнцыі з'яўляецца нешта новае. Зараз, напрыклад, для наведвальнікаў узводзіцца карчма. Адным словам, туды варта ехаць, як гэта ўжо зрабілі 562 тысячы гасцей з больш чым 90 краін свету. А ў цэлым лічба наведвальнікаў Белавежскай пушчы ў год набліжаецца да 300 тысяч.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА, Анатоля КЛЕШЧУКА і БЕЛТА.**



«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «Па радку «доўг за прадпрыемствам» адлюстроўвалася заработная плата — нарастаючым вынікам за тры месяцы»

**Яшчэ ў сакавіку работнікі аднаго з СВК у Шчучынскім раёне атрымалі разліковыя лісткі: будзённая справа. Разам з іншымі і наша заяўніца — даглядчык жывёлы на комплексе. У тым лістку жанчына ўбачыла радок «доўг за прадпрыемствам». Насупраць была сума запазычанасці за тры папярэднія месяцы — 1 820 000 рублёў агулам за снежань, студзень, люты. Аднак, сцвярджала далей жанчына, гэтых грошай яна потым не так і не атрымала. Больш за тое, пасля з разліковага лісткі знік і сам радок адносна доўгу прадпрыемства. Заяўніца далей распавяла, што куды толькі потым ні звярталася, нічога не магла дабіцца. Толькі адзінае тлумачэнне: адбыўся камп'ютарны збой. Аднак жанчына ў гэтыя словы не верыць.**

А чаму? З тэхнікай такое часам здараецца. Але нават калі не браць да ўвагі збой, доўг прадпрыемства перад сабой кожны работнік, які недаатрымаў нейкую частку заробленага, можа самастойна вылічыць. Няхай не цалкам дакладную лічбу, але хоць бы прыкладную, абапіраючыся на лічбы папярэдніх выплат. Нават калі меркаваць па ўзроўні заробку, ці мог у жанчыны ўтварыцца такі доўг за тры месяцы — на 1,8 мільёна, калі яна сама гаварыла, што сярэдняя зарплата яе складае каля 600 тысяч рублёў? Як толькі мы паспрабавалі ўдакладніць гэта, жанчына тут жа змяніла свае пытанне: маўляў, я ўвогуле не ведаю, як мне налічваюць грошы. Дапамажыце разабрацца: заробак ідзе ад пагадзіннай аплаты або ад прывагі жывёлы?

З гэтым пытаннем мы звярнуліся ва ўпраўленне сельскай гаспадаркі і харчавання Шчучынскага райвыканкама. Там нам пацвердзілі, што работніца СВК скардзілася не толькі ў раён. І па сутнасці праблемы ёй даваўся адказ.

— Налічэнне заработнай платы ў СВК адбываецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб аплаце працы, распрацаваным і зацверджаным агульным сходам упаўнаважаных па ўзгадненні з прафсаюзным камітэтам, за выкананы аб'ём работ па нормах выпрацоўкі і расцэнках, устаноўленых зыходзячы з тарыфнага разраду выконваемых работ, — удакладніла яшчэ раз па нашай просьбе **начальнік аддзела эканомікі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Алена ІВАНЧЫК**, якая ўжо раней разбіралася ў сітуацыі заяўніцы з выездам на месца. — Была праведзена праверка правільнасці налічэння заработнай платы за снежань 2009 года, студзень—сакавік 2010 года. За гэты перыяд устаноўленая норма працоўнага часу работніцай жывёлагадоўлі была выкананая. Аплата праводзілася за выкананы аб'ём работ — прывагу, іншым словам. Налічэнне аплаты працы праводзілася за атрыманую прадукцыю па расцэнках, разлічаных з тарыфнай стаўкі разраду адпаведнага віду работ.

Што ж датычыцца доўгу за прадпрыемствам, нам пацвердзілі таксама: на момант выдачы першага разліковага лістка за сакавік 2010 года праграма яшчэ не была дастаткова адладжаная. «Па радку «доўг за прадпрыемствам» адлюстроўвалася заработная плата нарастаючым вынікам за снежань 2009 года і студзень-люты 2010 года». Агучаная ў самым пачатку лічба ў 1,8 мільёна — гэта заробак за тры месяцы плюс адпускныя за 31 каляндарны дзень. У красавіку спецыялістамі ўлік быў канчаткова наладжаны, і цяпер разліковыя лісткі фарміруюцца належным чынам.

...Падчас разбору сітуацыі са скаргай у газету жанчыны высветлілася, што работніца СВК яшчэ раз нядаўна звярталася да эканамістаў гаспадаркі. Прасіла, каб у яе разліковым лістку дакладна пазначаліся ўсе зробленыя ёю на ферме віды работ і аплата за гэтую працу. Алена Іванчык заўважыла, што камп'ютарны праграмай такога не прадугледжана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ




(8 017) 287 19 68

**Дапамажыце, калі ласка, знайсці адказ на такое пытанне. Калі мы 40 гадоў назад пасяліліся ў невялікім казённым доміку, мяжа нашага зямельнага ўчастка праходзіла якраз па задняй сцяне доміка. Адразу за сцяной — суседскі агарод. Апошні капрамонт доміка быў гадоў 30 таму. Цяпер мы зноў збіраемся рамантаваць дом. Але справа ў тым, што суседка прыватызавала сваю зямлю. Мы не хацелі б нанесці ёй шкоды падчас рамонту. Акрамя таго, нам хацелася б мець магчымасць падыходзіць да сваёй сцяны і рэгулярна яе даглядаць. Ці ёсць такі закон, каб нам выкупіць у яе хоць два метры зямлі? Ці можна неяк інакш вырашыць гэтую праблему? Куды перш за ўсё нам патрэбна звяртацца?**

**А.С.**, *Магілёўская вобласць.*

# ДОМ НА МЯЖЫ

Адразу адзначу, што такога Закона, які б дазваляў прымусіць уласніка прадаць іншай асобе частку сваёй маёмасці, няма. Наадварот, артыкулам 8 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што грамадзяне самі і выключна па сваім меркаванні ажыццяўляюць грамадзянскія правы, якія ім належаць.

Але ў вашым выпадку ёсць і іншае выйсце. Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб зямлі прадугледжана ў некаторых выпадках (напрыклад, пры неабходнасці забеспячэння праходу, праезду, пракладкі і эксплуатацыі ліній сувязі, электраперадачы і да т.п., а таксама для іншых мэтаў) устанаўленне права абмежаванага карыстання чужым зямельным участкам (зямельнага сервітуту).

**ЦЯЛЕЦ.** Славалюбівыя задумы могуць увасобіцца ў жыццё, калі атрымаецца дзейнічаць вельмі акуратна і прытрымлівацца язык на людзях. Не перакладайце рашэнне жыццёва важных пытанняў на чужыя плечы. Калі дзейнічаць дыпламатычна і карэктна, то зможаце ўгаварыць начальства на што заўгодна. Загадзя падрыхтуйцеся да верагодных нядач у суботу, сустракайце іх у поўным узбраенні. У нядзелю адкладзіце хатнія клопаты і дазвольце сабе адпачыць.

**БЛІЗНЯТЫ.** Не спяшайцеся распавядаць пра сябе, інакш выбалбачаце шмат лішняга — спатрэбіцца нямала намаганняў для захавання свайго добрага імя. Неабходна змяніць цяперашнюю стратэгію ў бізнэсе, каб не апынуцца ў пройгрышы. Збярыцеся з сіламі і паспрабуйце не прапусціць важных падзей, якія адбываюцца вакол вас. Неадкладныя справы паспрабуйце вырашыць у аўторак і суботу. Нядзелю прысвяціце адпачынку і аналізу бягучых спраў і падзей.

**РАК.** Давядзецца нешта змяняць у стасунках з блізкімі людзьмі ці калегамі. Для ажыццяўлення задумы спатрэбіцца зусім крыху цярпення і поспеху. Паспрабуйце не дапускаць агрэсіі і злосці (як сваіх, так і чужых), гасіце злыя пачуцці ў зародку. Пастарайцеся змякчаць напружанне і пераключыць увагу навакольных на прыемныя думкі. У другой палове тыдня магчымы нечаканы паварот да лепшага ў партнёрскіх адносінах або судовых справах у выніку з'яўлення зусім новай інфармацыі. Узрасце ваша камунікабельнасць і ўдачлівасць у новых знаёмствах.

**ЛЕЎ.** Тэрмінова пачынайце новыя праекты, выкарыстайце ўсю сваю інтэлектуальную энергію, якая, на шчасце, менавіта цяпер не ведае межаў. Трапіцца спрыяльная магчымасць добра зарэкамендаваць сябе ў справах і далікатных даручэннях, давераных тымі, хто вышэй і мацней па становішчы. Гэты момант удалы для самарэалізацыі і праявы талентаў. Вы без цяжкасці зможаце заручыцца падтрымкай навакольных у шматлікіх пачынаннях.

**ДЗЕВА.** На працы, магчыма, давядзецца вярнуцца да старых праектаў, ад якіх вы па тых або іншых прычынах раней адмаўляліся. Захоўвайце раўнавагу, не дапускайце мітусні і не праяўляйце паспешлівасці ў справах. Вы поўныя сіл, так што дзейнічайце: у вас усё атрымаецца. Не ўпускайце шанца. Калі вас паспрабуюць уцягнуць у канфлікты блізкіх людзей, займіце нейтральную пазіцыю.

**ШАЛІ.** Пажадана ўціхамірыць фантазію, якая разгулялася, і не звяртаць увагі на беспадстаўныя чуткі. Усе дасягненні цяпер вельмі і вельмі каштоўныя, але іх давядзецца неўзабаве замацоўваць і нават адстойваць. Аўторак і серада на здзяйсненне добрыя для пабудовы планаў і канструявання розных праектаў уласнай будучыні. У чацвер радуйцеся, калі нічога неспадзяванага не адбудзецца, бо ўсе неспадзеўкі ў гэты дзень будуць не вельмі прыемнымі. У выхадныя да вас могуць прыехаць сваякі здалёку.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень будзе багаты на падзеі. Пачніце яго з планавання поспехаў, якіх вы жадалі б дасягнуць, — так вам будзе на сілах прымусіць Фартуну працаваць на сябе. Асабліва каштоўным капіталам будзе прыхільнасць сяброў і знаёмых. Аўторак удалы для зносін: верагодна, што падчас сяброўскай гутаркі вы атрымаеце цікавую прапанову. У сераду пажадана пазбягаць людных месцаў, бо менавіта вы можаце стаць аб'ектам незадаволенасці натоўпу. У пятніцу старайцеся не мітусіцца. На нядзелю варта прызначыць якія-небудзь сямейныя імпрэзы.

**СТРАЛЕЦ.** Аптымізм дапамажа перажыць складаны пачатак тыдня і забяспечыць неабходную дапамогу, прыцягваючы да вас сэрцы людзей. Ад начальства ў чацвер трымацца лепш далей, бо ваша ініцыятыўнасць будзе яго раздражняць. Пачакайце — сітуацыя хутка зменіцца. Магчымыя пэўныя праблемы ва ўзаемаадносінах з дзецьмі. Становішча спраў, якое склалася ў канцы тыдня, будзе падштурхоўваць вас да самастойнай дзейнасці або да пошуку новай працы.

**КАЗЯРОГ.** Планы і задумы, асабліва тыя, якія вы даўно выношвалі, могуць рэалізавацца і прынясуць поспех. Спрыяльна складзецца і сітуацыя на працы. У панядзелак смела прыступайце да рашэння праблем, якія даўно адкладваюцца. Дзелавым партнёрам пажадана падаць неабходны мінімум інфармацыі, прычым так, каб заінтрыгаваць іх. Вы ад такой таямнічасці толькі выйграеце. Пажадана не захапляцца вялікімі шумнымі кампаніямі, бо менавіта там вас можа падпільноўваць падман і расчараванне. Паспрабуйце ў меру пасціць дзяцей — інакш ім будзе цяжка вярнуцца да ўстаноўленага вамі парадку і правілаў.

**ВАДАЛЕЙ.** Выдатны тыдзень для раскрыцця творчага патэнцыялу, увасаблення ў жыццё новых ідэй. Эмоцыі ўлягуцца, душэўны стан прыйдзе ў раўнавагу. Тыдзень поўны канструктыўных сустрэч і прапаноў. Давядзецца часам займацца аднастайнымі, але неабходнымі справамі. Паспрабуйце прадумаць і асэнсаваць ваша стаўленне да выкананых задач. Добры час для пачатку далёкіх вандровак. Магчыма, варта адпачыць? У дачыненні да блізкіх давядзецца паслабіць сваю патрабавальнасць, бо яна можа справакаваць канфлікты.

**РЫБЫ.** Вашы паводзіны будуць падставай для ўсеагульнай зайздрасці. Атрымаецца злавіць хвалю шанцавання — і вы будзеце з такой лёгкасцю пераадольваць перашкоды, што любому з вольных або міжвольных назіральнікаў гарантаванае абвастрэнне пачуцця ўласнай непаўнавартасці. Паспрабуйце ўсё ж не лезці ў зусім ужо адкрытыя авантуры. Зможаце вырашыць рэкордную колькасць праблем. Паспрабуйце, тым не менш, не вельмі часта прапаноўваць дапамогу — ахвотнікі з выгадай і надоўга размясціцца на вашай шыі знойдуцца хутка.

ПРЫЕМНЫЯ КЛОПАТЫ

## Свята для ўсіх

**Не так ужо і шмат святаў, якія аднолькава любяць і дзеці, і дарослыя. Аднак Новы год з нецярпеннем чакаюць усе. Як лепей падрыхтавацца да самай чароўнай і вясёлай падзеі, падкажуць нашы парады.**

❄ Спачатку навядзіце парадак у доме. Без шкадавання выкіньце ўсё лішняе, што назапасілася за год. Напрыклад, старыя газеты і часопісы, пратэрмінаваныя лекі, паламаныя ручкі і алоўкі, пальчаткі і шкарпэткі без пары, патрэсканы ці пабітыя посуд і г. д. У кожным доме такога «дабра» хапае. Цяпер можна наводзіць чысціню. Загадзя перамыйце посуд, падрыхтуйце святочны абрус і сурвэткі, складзіце спіс прадуктаў, якія неабходна купіць да навагодняга стала.

❄ Калі вы яшчэ не купілі падарункі, неабходна гэта зрабіць і прыгожа ўпакаваць. Добра было б, каб усе ўспомнілі сваіх далёкіх і блізкіх сяброў і сваякоў, даслалі ім святочныя паштоўкі з цёплымі шчырымі пажаданнямі ці хоць бы перадалі электронныя прывітанні. Ад гэтай увагі ўсім стане крыху цяплей і радасней.

❄ Зрабіце рэвізію ёлачных цацак. Магчыма, некаторыя патрабуюць лёгкага рамонту ці ўвогуле замены. Цацкі можна купіць, а можна прыкласці крыху намаганняў і зрабіць эксклюзіўны варыянт сваімі рукамі.

**ШАРЫК СА СТАРОЙ ЭЛЕКТРАЛЯМПАЧКІ**



Для работы спатрэбіцца: электралямпачка, чырвоная і чорная фарбы, пшанічная мука, клей ПВА, пэндзаль, дробная соль, трывалы поліэтыленавы пакет, бясколерны лак для пазногцяў, дробныя бліскаўкі, рознакаляровыя кавалачкі тканіны, стэплер, залатая тасьма.

Пафарбуйце лямпачку, пакіньце сохнуць. Прыгатуйце «снег», якім будзеце дэкараваць верхнюю частку лямпачкі. Для гэтага змяшайце клей і звычайную муку, старанна перамяшайце да атрымання аднароднай смятанападобнай масы. Пры дапамозе пэндзля нанясіце яе на верхнюю частку лямпачкі. Падрыхтуйце контур: у чорную фарбу дадайце дробную соль і старанна перамяшайце, каб соль растала. Гатовую масу перакладзіце ў поліэтыленавы пакет, адрэжце кончык і, злёгку націскаючы, нанясіце контур на лямпачку (папярэдне малюнак можна намаляваць фламастэрам). Калі контур высахне, у месцы, дзе будуць знаходзіцца бліскаўкі, капніце бясколерным лакам і прыклейце іх.

Каб задэкараваць цокаль, з рознакаляровых кавалачкаў тканіны выражце тры палоскі рознай шырыні і злучыце пры дапамозе стэплера ці нітак так, каб атрымалася невялікая спаднічка. Надзеньце яе на цокаль і зафіксуйце пры дапамозе залатой тасьмы. З яе ж зрабіце пяцельку. На лямпачцы можна намаляваць і пыскі трусіка ці ката — сімвалаў, згодна з усходнім календаром, новага 2011 года.



❄ Праверце спраўнасць электрагірлянды і надзейнасць падстаўкі для ёлкі. Прадумайце навагодні дэкор жылля. З яловых галінак зрабіце вяночак, упрыгожце яго і павесьце на ўваходныя дзверы. Гэта будзе стварацьсвяточны настрой з самага ўваходу ў кватэру.

❄ Калі ў вас ёсць маленькія дзеці, не засцерагайце іх ад перадсвяточных клопатаў. Няхай яны разам з вамі ўдзельнічаюць ва ўсіх справах.

-2714-

ДА ВАШАГА СТАЛА

## Сустракаем год Белага труса

**Новы год нельга ўявіць без смачнага застолля. Усе гаспадыні свету становяцца да пліты, каб прадэманстраваць вяршыні свайго кулінарнага майстэрства. У вашу скарбонку прапануем рэцэпт салаты, прымеркаваны да галоўнага гаспадара наступнага года.**

**САЛАТА «ТРУСІК»**



*400 г крабавых палачак, 200 г кансерваванай кукурузы, 2-3 марынаваныя агуркі, 200 г цвёрдага сыру, маянэз, 0,5 цыбуліны, шклянка (можна больш) адваранага рысу, чорны молаты перац, соль.*

***Для ўпрыгажэння:*** *1 масліна, лісце зялёнай салаты, пёркі зялёнай цыбулі, 1 морквіна.*

Крабавыя палачкі, агуркі, цвёрды сыр нарэжце кубікамі, цыбулю здрабніце. З кукурузы зліце вадкасць. Пасаліце, паперчыце, запраўце маянэзам, але не многа, каб салата не развалілася.

Адварыце рыс. Пакладзіце на плазаватую талерку лісцікі салаты, а на іх — вялікі авал з гатовай салаты. Гэта будзе тулава труса. Зверху выкладзіце круг — галаву. Пакрыйце ўсё рысам. Каля галавы пакладзіце два невялікія камячкі з рысу — лапкі. Упрыгожце маслінамі (вочкі), цыбуляй (вусы) і морквай. Вушкі выражце з капусты, капніце на іх харчовай фарбай і разатрыце.

ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

## Шампанскае. Як піць і з чым?

**Сустрэчу Новага года прынята адзначаць шампанскім. Пад бой курантаў чуецца і звон келіхаў. Аднак піць шампанскае ўмеюць не ўсе. Навучыцеся разумець «яго мову», і толькі тады яно раскрые свае таямніцы.**

Шампанскае можна піць у якасці аперытыву. У гэтым выпадку да яго рэкамендуецца падаваць лёгкія закускі, напрыклад, сухое несалодкае пячэнне і цвёрдыя сыры, каб страўнік не пакутаваў ад яго кіслаты. Знаўцы сцвярджаюць, што традыцыя суправаджаць шампанскае шакаладам і апельсінамі забівае смак напою і псуе страўнік. З сухім шампанскім добра



спалучаюцца чорная ікра, вустрыцы, крэветкі, любыя сыры. З мясных прадуктаў падыдзе сыравэнджаны кумпяк ці дзічына.

Падаваць шампанскае лепш за ўсё ў вузкіх келіхах — так ідэальна захоўваецца букет і пеністыя ўласцівасці. Келіх павінен мець доўгую ножку, каб рука не саграявала чару, бо ідэальная тэмпература напітку ад +6 да +9°С. Наліваць у келіх варта не больш чым палову — менавіта так вы лепш адчуеце смак і пах.

Бутэльку з шампанскім пажадана паставіць у вядзерца з лёдам і падліваць у келіхі пакрысе. Пеністае не п'юць залпам, а паступовае даліванне ахаладжанага віна робіць яго заўсёды прыемным на смак.

-2715-

## КАБ ПАСКОРЫЦЬ РОДЫ

Сваі людзі

**Падчас родаў у ход ішлі ўсе магчымыя спосабы дапамогі, якія зноў-такі грунтаваліся на прынцыпе падабенства. Вадой абмывалі заручальныя пярсцёнкі мужа і жонкі і давалі цяжарнай папіць яе. У кубачак з вадой маглі апускаць вугольчыкі, якія «выскачылі» з печы, калі яна гарэла. Лічылася: як лёгка выляцеў вугольчык з печы, так хутка павінны прайсці і роды.**

● Падчас родаў маглі быць розныя непрадбачаныя сітуацыі: моцны крывацёк, разрывы, зрушэнні тазасцегнавых суставаў. Таму бабка-павітуха тут жа шаптала замову на спыненне крыві.

● У традыцыйнай культуры розных славянскіх народаў існавала павер'е, што парадзіха на працягу сарака дзён пасля родаў з'яўляецца «нячыстай», «паганай». Узнік шэраг абмежаванняў у яе паводзінах: нельга было заходзіць у храм, падыходзіць да бажніцы, браць у рукі абразы, аглядаць пчол, даіць і выганяць карову ў поле, асвячаць яе пры першым выгане на пашу, хадзіць у госці на вялікае свята, ісці на вяселле, падаваць на стол хлеб, наразаць яго, хадзіць у свіран, дзе захоўвалася збожжа або мука.

● Шматлікія рытуальныя дзеянні былі скіраваны на праектаванне далейшага лёсу дзіцяці. З гэтай нагоды бабка ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а пакрывала іх саматканым палатном, каб паспрыяць багаццю нованароджанага.

● Пупавіну хлопчыку перарэзалі на нажы, сякеры («каб імі добра валодаў»), на кавалачку хлеба, пазней на кніжцы. Пупавіну дзяўчынцы перарэзалі на грэбні, «каб добра прала». Часам, каб засерагчы дзіця ад грыжы, павітуха перагрызала яе зубамі. Пупавіну перавязвалі суровай ніткай або пасмай цярэбленага лёну, у якую ўплятаўлі (!) валасы маці. Валасы выстрыгаліся з правай касы або правай скроні, «каб дзіця ўсё жыццё было прывязанае да маці».

● Праз некалькі дзён пупавіну завязвалі ў вузельчык і клалі ў куфар. Калі ж дзіцяці спаўнялася тры гады, гэты вузельчык даставалі і давалі малому развязаць яго («развязаць свой розум»).

● Дзіцячае месца («пасцельку») заўсёды акуратна вымывалі, загортвалі ў анучу разам з лустай чорнага хлеба, яйкам або некалькімі галоўкамі цыбулі, усё гэта клалі ў лапаць і закопвалі ў якім-небудзь патаемным месцы (у падполлі, склепе, каля печкі, покуці). Але часцей за ўсё паслед — сімвал прыроднай калыскі — закопвалі пад рог хаты (калі нараджаўся хлопчык), «прывязваючы» дзіця да роднага дома і жадаючы яму стварыць сям'ю, пасядзець на покуці на вяселлі. Калі ж нараджалася дзяўчынка, то паслед, а то і пупавіну закопвалі пад парогам, каб «пайшла за парог» — выйшла замуж .

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## 18 снежня

*Дзве даты*

**1920 год** — створаны Савет Народных Камісараў Беларускай ССР, найвышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзяржаўнай улады, урад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1920-46 гадах. Быў створаны згодна з дапаўненнямі да Канстытуцыі 1919 г., прынятымі 2-м Усебеларускім з'ездам Саветаў. Да сакавіка 1924 года абавязкі старшыні ЦВК і СНК, наркама па замежных справах выконваў А.Р. Чарвякоў. Членамі СНК былі народныя камісары (кіраўнікі наркаматаў), старшыні Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі (ВСНГ) і ЧК. Пры СНК дзейнічалі пастаянныя камісіі: Эканамічная нарада, Камісія заканадаўчых думак, Дзяржаўная планавая камісія. СНК БССР ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва рэспублікай праз наркаматы, выканкамы Саветаў, прымаў пастановы і выдаваў распараджэнні па ўсіх пытаннях, якія не ўваходзілі ў выключную кампетэнцыю Усебеларускага з'езду Саветаў, ЦВК БССР і яго Прэзідыума. СНК быў падсправаздачны з'езду Саветаў і ЦВК БССР.



**1917 год** — у Мінску пачаў работу Першы Усебеларускі з'езд. Ён прыняў рэзалюцыю аб праве беларускага народа на самавызначэнне і ўсталяванне дэмакратычных формаў кіравання. З'езд працягваўся з перапынкамі да 31 снежня. Распараджэннем мясцовых органаў савецкай улады ён быў распушчаны.

*Цытата дня*

***«Як цёплая вопратка абараняе ад сцюжы, так вытрымка абараняе ад крыўды. Памнажай свае цярпенне і спакой, і крыўда, якой бы горкай ні была, цябе не закране».***

**Леанарда да Вінчы (1452—1519), італьянскі жывапісец, скульптар, вучоны.**

### У СТАЛІЧНЫМ ЗААПАРКУ «ЦІХІ ЧАС»

У Мінскім заапарку ўпалі ў зімовую спячку мядзведзі Трыстан і Ізольда. Летам і ўвосень мішак кармілі ўволю, яны хутка набіралі вагу і з надыходам халадоў, паддаўшыся прыроднаму інстынкту, заснулі. Разам з імі палеглі на бакавую барсучыха Фіфа і вожыкі. А вось яноты і енотавідны сабака, насуперак законам прыроды, браць з іх прыклад пакуль не збіраюцца.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**НЯДЗЕЛЯ, 19 СНЕЖНЯ**

Дзень не толькі камфортны ў эмацыйным плане, але і абсалютна прыдатны для забаў і адпачынку любой ступені актыўнасці — ад расшыфроўкі старажытных манускрыптаў на канапе да паходаў і паездак па месцах атрымання пазітыўных эмоцый.

**ПАНЯДЗЕЛАК, 20 СНЕЖНЯ**

Дасягненне нават самых сціплых тактычных мэтаў сёння будзе спалучана з некаторымі цяжкасцямі. Дзень атрымаецца няўстойлівым, поўным напружання і вельмі далёкім ад гармоніі, што не толькі дадасць эмацыйных цяжкасцяў, але і наўрад ці створыць умовы, для практычных поспехаў.

**АЎТОРАК, 21 СНЕЖНЯ**

Павышэнне ўзроўню дынамікі як у нашым арганізме, так і ў сённяшніх працэсах у цэлым стане галоўнай зменай. Праўда, сур'ёзнымі пытаннямі, якія патрабуюць усебаковага абдумвання (асабліва звязанымі з грашыма) лепш пакуль не займацца — схільнасць да імпульсіўных крокаў і недахоп грунтоўнасці могуць саслужыць дрэнную службу.

**СЕРАДА, 22 СНЕЖНЯ**

Рэзка ўзрасце верагоднасць канфліктаў з навакольнымі і рызыка не знайсці агульнай мовы з тэхнікай. Паспрабуйце не перагружаць дзень зносінамі і будзьце асцярожныя, у прыватнасці, за рулём. Ёсць сэнс адкласці найбольш адказныя справы і правесці дзень, наколькі гэта магчыма, спакойна і стрымана.

**ЧАЦВЕР, 23 СНЕЖНЯ**

Дзень ёсць сэнс правесці ў роздумах і абмеркаваннях, а не ў пэўных кроках — калі казаць пра сур'ёзныя пытанні, а не бытавыя і бягучыя працоўныя занядкі. Прынамсі, пачынаць што-небудзь новае, пераадольваючы агульны запаволены фон — справа няпростая, якая патрабуе незвычайнай унутранай энергіі.

**ПЯТНІЦА, 24 СНЕЖНЯ**

Ёсць сэнс засяродзіцца на папаўненні запасаў маральных сіл, а працоўныя прарывы адкласці да больш прыдатнага для іх часу, да таго ж пачнуць «усплываць» і патрабаваць нашай увагі старыя і даўно забытыя «хвасты».

**СУБОТА, 25 СНЕЖНЯ**

Дзень не дасць падставы да незадавальнення. Вядома, калі хтосьці збіраўся бліснуць нечаканым арганізаваннасцю, дакладнасцю або ўпартасцю, то магчымыя варыянты, затое ўсе, хто хацеў адпачыць і набрацца сіл, павінны застацца задаволеныя. Вечар у плане адпачынку і забаў абяцае самыя вясёлкавыя далягляды.

## Усміхнемся

**Заходзяць два мужыкі, якія ўжо выпілі, у краму. Падыходзяць да аддзела з півам і доўга выбіраюць. Потым падыходзяць да прадаўшчыцы і насілу вымаўляюць: «Два Велкапаповіцкія Казлы». Яна: «Я бачу, і што далей?»**

☺

Дзеці — кветкі жыцця :)
— Дачушка, ты рукі памыла?
— Мама, але ж я толькі што пад даждҗом была...

☺

**Мужыкі, не будзьце дурнямі! Калі ваша жонка адчыняе вам дзверы і пры гэтым без прычыны ўсміхаецца, значыць яна зрабіла новую стрыжку. Звярніце ўвагу і пахваліце.**

☺

Усё самае смачнае і салодкае ў любой сям'і дастаецца дзецям. Тое, што крыху горш, — маці. А зусім ужо горкае і агіднае — такое, што нават закусваць даводзіцца, традыцыйна прыпадае на долю бедных татаў.



## Яшчэ адна перамога ў скарбонку «Звязды». «Найлепшае фота» — у нашага фотакарэспандэнта Марыны БЕГУНКОВАЙ

Цырымонія ўзнагароджання журналістаў-пераможцаў конкурсу «ЕС-Беларусь-2010» адбылася 16 снежня ў Мінску. Конкурс ладзіўся ў трох намінацыях: «Найлепшы інфармацыйны матэрыял», «Найлепшы аналітычны матэрыял» і «Найлепшае фота». Конкурс «ЕС-Беларусь-2010» ладзіла Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Беларусі з мэтай «пашырэння і падтрымкі прафесійнага асвятлення пытанняў, звязаных з развіццём стасункаў паміж Еўрасаюзам і Беларуссю». Спаборнічалі журналісцкія матэрыялы, якія з'явіліся ў СМІ з 1 студзеня да 15 кастрычніка 2010 г. Павіншаваць пераможцаў прыехаў прадстаўнік дэлегацыі ЕС у Беларусі Рамунас Янушаўскас.

«Звязда» — адзіная з рэспубліканскіх беларускіх выданняў была адзначана ўзнагародай. На гэтым конкурсе адзін фотарэпартаж нашага фотакарэспандэнта Марыны Бегунковай «Усе ў Глушу!»(гл. 6 кастрычніка 2010 года), які выйшаў у рамках аўтарскага праекта «Турыстычны брэнд Беларусі», атрымаў намінацыю «Найлепшае фота».

Віншуем калегу!



**Фота Сяргея БАЛАЯ.**



# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ВЫРАЗИ, ЧТО НАКОПИЛОСЬ!»

**Организатор рекламной игры:**

ИП «Паблисис Диалог», далее «Организатор», 220000, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Короля, д. 51, этаж 7, помещ. 14, УНП 191123386, свидетельство о регистрации № 191123386 от 07 сентября 2009, выдано Минским городским исполнительным комитетом. Действует на основании договора **№ HPC11-007 от 26/11/2010 г.** в интересах Hepta G B.V. (HEPTA GROUP), представляющее интересы Hewlett-Packard Europe BV (Швейцария), далее «Заинтересованное лицо», Фаненпаркт 382 1018АК, Амстердам, Королевство Нидерланды, VAT # NL814335512B01.

**Участники:**

К участию в рекламной игре приглашаются граждане Республики Беларусь и лица, постоянно проживающие на территории республики, за исключением:

- собственников, работников, участников или акционеров организаций, связанных с данной рекламной игрой;
- сотрудников рекламных агентств и компаний, участвующих в подготовке и проведении рекламной игры, а также членов семей указанных выше лиц.

**Срок и территория проведения рекламной игры:**

Рекламная игра проходит с 17.12.2010 г. по 07.02.2011 г. включительно на территории Республики Беларусь.

Заполнение купонов для участия в рекламной игре осуществляется в торговых точках, расположенных по адресам, указанным в п. 6 к настоящим Правилам.

**Призы:**

Во время проведения рекламной игры разыгрываются следующие призы общей стоимостью 22 658 892 (Двадцать два миллиона шестьсот пятьдесят восемь тысяч восемьсот девяносто два) белорусских рубля:

| № п/п | Наименование | Цена за единицу с НДС, бел. руб. | Кол-во, шт. | Стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | HP SimpleSave Portable Harddrive320 GB жесткий диск арт. WE115AA | 341650,8 | 15 | 5 124 762 |
| 2 | HP SimpleSave Portable Harddrive 500 GB жесткий диск арт. WE116AA | 445652,4 | 20 | 8 913 048 |
| 3 | HP SimpleSave External Harddrive 1 TB жесткий диск арт. WE117AA | 447253,2 | 10 | 4 472 532 |
| 4 | HP SimpleSave External Harddrive 2 TB жесткий диск арт. WE118AA | 829710 | 5 | 4 148 550 |
| | **ИТОГО:** | | | **22 658 892** |

Призовой фонд сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица.

**Наименование товаров (работы, услуги) или наименование их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:**

Рекламная игра проводится с целью стимулирования продаж ноутбуков серий HP PROBOOK и HP PAVILION (в том числе G-серии) на территории Республики Беларусь.

**Порядок участия в рекламной игре:**

Для участия в рекламной игре необходимо в период с 17 декабря 2010 г. по 24 января 2011 г.:

1) Приобрести как минимум один ноутбук серии HP PROBOOK или серии HP PAVILION (в том числе G-серии) в торговых точках на территории Республики Беларусь.

2) Обратиться в любую торговую точку согласно списку, представленному на сайте hp.by/game, для получения купона участника.

При покупке одного ноутбука серии HP PROBOOK или одного ноутбука серии HP PAVILION (в том числе G-серии) покупатель получает 1 (Один) купон участника; при покупке двух ноутбуков – 2 (Два) купона и т.д.

3) Заполнить купон персональными данными (Ф.И.О., дата рождения, адрес, контактный телефон, модель ноутбука, серийный номер ноутбука, место приобретения, номер и дата товарного чека, откуда узнали о рекламной игре) участника рекламной игры. Отсутствие указания серийного номера продукта (ноутбука) либо указание серийного номера продукта, не входящего в список официально завезенной для продажи на территории Республики Беларусь компьютерной техники торговой марки HP, будет являться основанием для непринятия купона к участию в розыгрыше.

4) Сохранить чек, подтверждающий факт покупки ноутбука/ов, и предоставить его вместе с заполненной анкетой продавцу для проверки заполнения анкеты. Товарный чек остается на руках у покупателя.

5) Сдать продавцам торговых точек, указанных в списке ниже, заполненный купон до 24 января 2011 г. включительно для участия купона в розыгрыше.

Купоны, заполненные неразборчиво, неправильно или не полностью, рассмотрению не подлежат. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные участниками рекламной игры при заполнении купонов.

Один гражданин может участвовать в игре неограниченное количество раз.

**Порядок розыгрыша призов рекламной игры и их выдачи победителям:**

Розыгрыш призов состоится 31 января 2011 года в офисе ИП «Паблисис Диалог» по адресу: г. Минск, пл. Свободы, 4, комн. 314.

Купоны участников помещаются в лототрон и перемешиваются. После этого назначенный комиссией человек извлекает наугад 15 (Пятнадцать) купонов, которые определяют обладателей 15 (Пятнадцати) жестких дисков HP SimpleSave Portable Harddrive320 GB арт. WE115AA.

Выигравшие купоны не продолжают участвовать в дальнейшем розыгрыше.

После этого извлекаются наугад 20 (Двадцать) купонов, которые определяют обладателей 20 (Двадцати) жестких дисков HP SimpleSave Portable Harddrive 500 GB арт. WE116AA.

Выигравшие купоны не продолжают участвовать в дальнейшем розыгрыше.

После этого извлекаются наугад 10 (Десять) купонов, которые определяют обладателей 10 (Десяти) жестких дисков HP SimpleSave External Harddrive 1 TB арт. WE117AA.

Выигравшие купоны не продолжают участвовать в дальнейшем розыгрыше.

После этого извлекаются наугад 5 (Пять) купонов, которые определяют обладателей 5 (Пяти) HP SimpleSave External Harddrive 2 TB арт. WE118AA.

Председатель комиссии объявляет результаты розыгрыша. После этого все купоны извлекаются из барабана и помещаются в специальный ящик. Комиссия опечатывает ящик лентой, на которой все члены комиссии ставят свои подписи.

Победители будут извещены о факте победы письменно и по телефону не позднее 07 февраля 2011 года.

Победители могут получить свой приз по адресу: г. Минск, пл. Свободы, 4, комн. 314 с 7 по 28 февраля 2011 года включительно в рабочие дни с 10.00 до 17.00.

Для получения приза необходимо предъявить паспорт.

Обязательства по уплате налога в связи с получением приза, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, полностью возлагаются на победителей рекламной игры.

Победителям рекламной игры выигранный приз не обменивается на какой-либо другой приз, а также не может быть выплачен денежный эквивалент стоимости.

Отказ от приза должен быть оформлен в письменной форме.

**Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:**

Заседания комиссии по проведению игры будут проходить по адресу: г. Минск, пл. Свободы, 4-314.

Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ИП «Паблисис Диалог». В состав комиссии входят 5 человек – председатель и четыре члена комиссии:

- Ильющенко Татьяна Сергеевна – ИП «Паблисис Диалог», директор (председатель комиссии);
- Неделько Виктория Михайловна – ИП «Паблисис Диалог», специалист по рекламе;
- Горбацевич Сергей Николаевич – ИП «Паблисис Диалог», специалист по рекламе;
- Гречко Светлана Ивановна – ИП «Паблисис Диалог», главный бухгалтер;
- Ворожун Сергей Анатольевич – Hepta G B.V. (HEPTA GROUP), финансовый директор.

Решение комиссии признается действительным при наличии на заседании большинства членов ее зарегистрированного состава. Один из членов комиссии ведет протокол заседаний комиссии.

В протоколе заседания комиссии отражаются время и место проведения розыгрыша призового фонда либо отбора участников розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты заседания и сведения о победителях и обладателях призов рекламной игры.

Протоколы подписывают все члены комиссии, присутствующие на заседании комиссии.

Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша призов рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

**Прочие условия**

Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

Результаты рекламной игры будут опубликованы в том же СМИ до 07 февраля 2011 года.

Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение призов.

В случае, если победителем является несовершеннолетний гражданин, то приз получает один из его законных представителей по предъявлении паспорта, свидетельства о рождении этого несовершеннолетнего гражданина.

Факт участия в рекламной игре означает, что участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, фотографии, высказывания могут быть использованы организатором в рекламе данной рекламной игры.

Участник рекламной игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые организатором рекламной игры для получения приза.

Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие участников с настоящими Правилами рекламной игры.

По вопросам организации рекламной игры обращаться по телефону: (017) 289 10 09.

Свидетельство о регистрации рекламной игры, зарегистрированной в Министерстве торговли Республики Беларусь за № 1832 от 16 декабря 2010 г.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.24 | 15.48 | 7.24 |
| Віцебск — | 8.21 | 15.30 | 7.09 |
| Магілёў — | 8.14 | 15.38 | 7.24 |
| Гомель — | 8.02 | 15.43 | 7.41 |
| Гродна — | 8.38 | 16.04 | 7.26 |
| Брэст — | 8.30 | 16.14 | 7.44 |

**Месяц**
*Поўня 21 снежня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**
**Пр.** *Генадзя, Савы, Сяргея.*
**К.** *Ларысы, Багуслава, Віктара, Грацыяна, Паўла.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



## НАДВОР'Е на заўтра







## АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

**Па гарызанталі:** Абарыген. Пірат. Ураза. Рупар. Юкон. Німб. Ратонда. Уран. Рот. Газ. Сопка. Марс. «Ака». Купа. Ная. Фінал. Шкала. Марошка. Столік. Ікар. Юта. Люд. Тэрыкон. Сінап. Бэра. Атака. Камар. Ата. Руль. Алфавіт. **Па вертыкалі:** Цунамі. Праём. Яшма. Карпа. Сатурн. Грабар. Юпітэр. Аск. Лорд. Ула. Апаш. Бакал. Ізюбр. Карэта. Барак. Рама. Орт. Таката. Тона. Арал. Тост. Тур. Кіно. Нептун. Люк. Паліто. Журба. Авал. Кандыдат.

**Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.**




**Напярэдадні Новага года ў кожнай сям'і вядуцца гарачыя абмеркаванні з нагоды правядзення будучага свята, упрыгажэння кватэры і, безумоўна, меню навагодняга стала. Прачытала мноства інфармацыі і парадаў наконт таго, як залагодзіць Труса (або Ката) кулінарнымі вытанчанымі стравамі і прыйшла да высновы, што галоўнае на навагоднім стале 2011 — гэта ўбранне і колеравая гама. У афармленні страў можна смела выкарыстоўваць усе адценні жоўтага колеру, аранжавы, зялёны, а таксама ў неабмежаванай колькасці прымяняць металічныя вырабы, паколькі стыхія знака — метал. Цэнтральнае месца святочнага стала павінна заняць страва, напоўненая яблыкамі, грушамі, вінаградам, апельсінамі, мандарынамі і — успамінаем галоўны ласунак труса — апетытнай морквіной. На святочным застоллі павінны пераважаць агародніннія і фруктовыя закускі і салаты, што, наогул, зусім нядрэнна, калі ўлічыць, з якім жахам мы звычайна набліжаемся да шаляў пасля сустрэчы Новага года. Не забудзьцеся ўпрыгожыць стравы вялікай колькасцю зеляніва — шпінатам, кропам, лісцем салаты, пятрушкай. Мясныя стравы на навагоднім стале наўрад ці будуць адобраныя Трусам, але, калі вы не можаце абысціся без мяса, суцішайце сябе думкай, што ў іншым варыянце гаспадаром года лічыцца Кот, які любіць і рыбку, і мяса. Для прыгатавання гарачых страў лепш выкарыстоўваць курыцу або свініну. Не варта захапляцца і алкаголем: металічная стыхія — праціўніца стыхіі вады і іншай вадкасці. Лёгкія лікёры і кактэйлі ўдала заменяць моцныя спіртныя напоі. Але галоўныя кампаненты навагодняга стала — выдатны святочны настрой і шчаслівыя ўсмешкі.**

**Ды і як можна не парадавацца, калі пасля таго, як цэлы дзень мітусіўся, наводзіў парадкі і галадаў, — на стале такая прыгажосць!!!**

### КУРЫЦА Ў ЗЯЛЁНЫМ ФУТРЫ



***Нам спатрэбіцца:*** *1 кг адварнога курынага мяса, 150 г чарнасліву, 250 г зялёнай цыбулі, 1 ст. лыжка лімоннага соку, крыху алею, прыправы, што падыходзяць да курыцы (часнок, кары, пятрушка), любы салодка-востры соус, можна ўзяць грэцкія арэхі.*

Цыбулю наразаем (больш зялёную частку лепш пакінуць для самага верхняга пласта салаты), курыцу разбіраем на дробныя кавалкі (я гэта раблю рукамі), чарнасліў расцісканем як манеткі. На дно выкладваем першы слой — зялёную цыбулю, зверху некалькі кропель алею. Другі слой — курыца, зверху некалькі кропель лімоннага соку і соусу, кладзём некалькі штук чарнасліву і змазваем няшмат маянэзам. Паўтараем слаі яшчэ раз. Для пікантнасці можна пасыпаць чарнасліў здробненым грэцкім арэхам. Астатняй цыбуляй упрыгожыць верх салаты. З дапамогай чарнасліву і маянэзу робіць цыферблат і стрэлкі.

### ПАДАРУНАК

Прывабнасць гэтага шэдэўра ў тым, што салату можна прыгатаваць абсалютна любую, галоўнае — гэта афармленне з варанай морквы.

***Вазьміце:*** *4 яйкі, 1 яблык, 0,5 бляшанкі кансерваваных шампіньёнаў, 150 г крэветак, вінаград, сок паловы лімона, соль, перац, маянэз, 2 вараныя морквы для ўпрыгажэння.*



Моркву і яйкі адварыць. Нарэзаць кубікамі бялкі, яблык, шампіньёны, крэветкі, вінаград, пасаліць, паперчыць, спырснуць сокам лімона, заправіць маянэзам і перамяшаць. Узяць кантэйнер, выслаць харчовай плёнкай, пакласці і ўтрамбаваць салату, перавярнуць на талерку, зняць плёнку, пакрыць зверху і з бакоў надзёртым жаўтком і «перавязаць» бантам з морквы.

### БУКЕТ БЭЗУ

***Нам спатрэбіцца:*** *5—6 бульбін, 1 цыбуліна, 300—400 г вэнджанай каўбасы, 2—3 кісла-салодкія яблыкі, міндаль, 3 яйкі, 1 бляшанка кансерваваных ананасаў, 4—5 галінак пятрушкі, маянэз.*



Выкладваем слаямі дзёртую вараную бульбу, парэзаную кубікамі цыбулю, вэнджаную каўбасу, нарэзаную палоскамі, дзёрты на буйной тарцы яблык, крыху здробненых міндальных арэхі, дробна парэзаны ананас. Кожны слой прамазваем маянэзам. Слаі можна паўтарыць 2 разы.

Цяпер пачынаем упрыгожваць. З пятрушкі выкладваем галінкі бэзу. А для саміх кветак трэба падзерці на тарцы яечны бялок, выкласці яго ў чайную лыжку, ушчыльніць і перавярнуць на зяленіва. Для атрымання бэзавых кветак афарбаваць бялок сокам буракоў.

### СЫРНЫ РУЛЕТ З СЁМГАЙ

***Нам спатрэбіцца:*** *200 г цвёрдага сыру, 30 г зеляніва кропу або пятрушкі, 300 г слабасалёнай сёмгі або фарэлі.*

Сыр надзерці на тарцы, зяленіва дробна парэзаць. Рыбу парэзаць тонкімі скрылікамі. Сыр змяшаць з зяленівам, пакласці ў невялікую каструлю, паставіць на вадзяную лазню і награваць, пакуль сыр не расплавіцца. Сырную масу выкласці на поліэтыленавую плёнку, накрыць іншай плёнкай і раскачаць паміж плёнкамі ў тонкі пласт. Затым верхнюю плёнку зняць, раскласці кавалачкі рыбы і скруціць рулетам, паступова аддзяляючы сырны пласт ад ніжняй плёнкі. Рулет пакласці пад лёгкі прэс і паставіць у халадзільнік. Затым нарэзаць парцыённымі кавалкамі, выкласці на талерцы і ўпрыгожыць зяленівам.

### САСНОВАЯ ШЫШКА

***Вазьміце:*** *3—4 бульбіны, 200 г вэнджанай курыцы, 1 цыбуліну, 1 бляшанку кансерваванай кукурузы, 3 яйкі, 150—200 г плаўленага сыру, арэхі (любыя, на ваш смак), міндаль (для ўпрыгажэння), размарын або яловыя галінкі.*

Яйкі і бульбу адварыць і падзерці на буйной тарцы. Курыцу парэзаць кубікамі. Цыбулю дробна парэзаць і абліць кіпенем. Сыр надзерці на тарцы і перамяшаць са здробненымі арэхамі. Салату выкладваць слаямі ў форме шышак, прамазваючы кожны слой маянэзам у наступнай паслядоўнасці: бульба; курыца; цыбуля; кукуруза; яйкі; сыр з арэхамі. Зверху салату абмазаць маянэзам і ўпрыгожыць міндалем і зяленівам. Навагодняя салата гатова!



### НАВАГОДНІ АНЕКДОТ

*Выклік на дом Дзеда Мароза! Званіце па нашым тэлефоне, і вам адразу ж адключаць ацяпленне!*

***(Працяг будзе.)***

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ: тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by.

Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33 310. Індэкс 63850.
Зак. № 6177. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12